

МІСІЯ – КАРМІЦЬ ХЛЕБАРОБАЎ
3

ДА ПРАФЕСІІ ЧЫГУНАЧНІКА
9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЖНІЎНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 153 (30287)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр БАХАНОВІЧ, першы намеснік міністра адукацыі:**

*«Асаблівасцю прыёму мэтавікоў гэтага года з'яўляецца павышэнне патрабаванняў да заказчыкаў кадраў (неабходнасць забеспячэння конкурсу кожным заказчыкам па большасці спецыяльнасцяў), павышэнне патрабаванняў да паспяховасці абітурыентаў — уведзене ніжняга парога сярэдняга бала дакумента аб адукацыі не ніжэй за 7,0. План прыёму мэтавікоў сёлета склаў 5,6 тысячы месцаў (на тысячу месцаў больш, чым летась). Колькасць абітурыентаў, якія падалі дакументы, перавысіла 6 тысяч. У выніку залічана на 1,1 тысячы мэтавікоў больш, чым у 2023 годзе. Найбольшая колькасць з іх залічана на медыцынскія, педагагічныя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці.*

# Разам ствараць прыгажосць

**Стварэнне кветкавых кампазіцый да памятных дат ужо стала добрай традыцыяй жыхароў дома № 18 па сталічнай вуліцы Калініна. Так, у 2019-м напярэдадні святкавання 75-годдзя вызвалення Беларусі перакрыжаванне вуліц Кузьмы Чорнага і Калініна ўпрыгожыў цудоўны кветнік з ружамі, які красаваў усё лета. А сёлета ва ўнутраным дворыку з'явілася новая кампазіцыя, цэнтрам якой з'яўляецца альпійская горка ў асяроддзі кустоў і шматгадовых травяністых дэкаратыўных раслін. Знакавых дат, да якіх можна было прымеркаваць гэту падзею, у 2024-м шмат: 80-годдзе вызвалення Беларусі, 55-годдзе Першамайскага раёна і 65-годдзе дома № 18! Асабліва каштоўна, што ў стварэнні гэтага куточка рукатворнай прыгажосці ўдзельнічалі жыхары навакольных дамоў. Кожны дапамагаў чым мог: хтосьці перавозіў камяні і зямлю, хтосьці закупляў расліны, былі і тыя, хто дзяліўся саджанцамі са сваіх кветнікаў і дачных участкаў.**

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**








## КОРАТКА

- **Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 жніўня 2024 года, паводле папярэдніх звестак, склалі $8,532 млрд у эквіваленце.**
- Пашпарты гатоўнасці школ да новага навучальнага года павінны быць падпісаны да 20 жніўня.
- **Каля 40 працэнтаў шматдзетных сем'яў ужо атрымалі дапамогу на падрыхтоўку дзяцей да навучальнага года.**
- XXX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» пройдзе з 1 да 8 лістапада.
- **Група з 43 дзяцей і пяці суправаджаючых дарослых з ДНР прыехала на аздараўленне ў Беларусь.**

ISSN 1990 — 763X

Эксклюзіў

## Надзейная платформа адзінства грамадства

**Старшыня ФПБ Юрый СЯНЬКО — аб ролі і задачах беларускіх прафсаюзаў**



«Варта імкнуцца да лепшага», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрыем Сянько. Кіраўнік дзяржавы зарыентаваў апаратыўна рэагаваць на запыты і патрэбы работнікаў, акрэсліў шэраг стратэгічных задач, якія неабходна вырашаць. Падчас сустрэчы Прэзідэнт даручыў увесці дадатковыя матэрыяльныя стымулы для працуючых пенсіянераў, а таксама папрасіў прафсаюзы актыўна падключыцца да ўборачнай. Якая работа вядзецца па гэтых кірунках, што адбываецца ў самай масавай грамадскай арганізацыі нашай краіны (членамі прафсаюзаў з'яўляюцца каля 4 мільёнаў чалавек, якія ўваходзяць у 24 тысячы «пярвічак»), чым адметная беларуская мадэль сацыяльнага партнёрства і карысны кітайскі досвед, у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый СЯНЬКО.

СТАР. 4-5

У сезон

## ПАСМАКАВАЦЬ ХЛЕБ, ПАЙСЦІ НА НАЧНУЮ ЛЯСНУЮ ЭКСКУРСІЮ, АДЧУЦЬ БЫТ ПАЛЕШУКОЎ

**Расказваем пра галоўныя турыстычныя падзеі жніўня**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Апошні летні месяц праходзіць пад знакам падзейнага турызму. Музычныя, гістарычныя, гастранамічныя і іншыя фестывалі, як рэгіянальныя, так і нацыянальныя, запрашаюць усіх ахвотных. Ну а кульмінацыяй стане 17 жніўня — у гэты дзень у Беларусі пройдзе адразу тры знакавых мерапрыемствы, якія сталі сапраўднымі турыстычнымі брэндамі нашай краіны — «Бацькава булка» ў Свіслачы, «Шлях цмока» ў Бярэзінскім біясферным запаведніку і «Кліч Палесся» ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі». Калі яшчэ не вызначыліся, куды паехаць, — паспяшайцеся, бо кожны з фестываляў мае свае незабыўныя фішкі і асаблівасці. І адзінае, чаго не варта рабіць ў гэты выхадны — заставацца дома.

СТАР. 13

Блізкая ўлада

# Нязначных праблем не бывае

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян

**Падобныя прыёмы праводзяцца пастаянна, і для членаў Савета Рэспублікі яны вельмі важныя. З красавіка да ліпеня бягучага года сенатарамі праведзена 186 асабістых прыёмаў, 92 прамыя тэлефонныя лініі. Разгледжана звыш 1960 зваротаў. За кожным з іх — гісторыі людзей, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Таму, як неаднаразова падкрэслівала Наталля Качанава, трэба ўважліва разглядаць кожную канкрэтную сітуацыю і прыкладаць максімум намаганняў, каб дапамагчы чалавеку.**



Фота БелТА.

«Работа са зваротамі грамадзян з'яўляецца адным з асноўных кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі. І сенатары, і Старшыня няўхільна выконваюць патрабаванні заканадаўства і рэгламенту. Сёння па традыцыі спектр пытанняў дастаткова шырокі. Што хацелася б адзначыць: на гэты раз людзі звяртаюцца са шматлікімі пытаннямі, якія ўжо прыняты да разгляду экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі. І што радуе: пазіцыя экспертаў, членаў Савета Рэспублікі супадае з пазіцыяй грамадзян. Гэта значыць, работа ідзе ў адзіным рэчышчы, адпавядаючы спадзяванням і чаканням насельніцтва», — адзначыў у размове з журналістамі **Сяргей БЕРВІН, намеснік начальніка інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі.** Па яго словах, самая распаўсюджаная праблема, з якой грамадзяне звяртаюцца да сенатараў, — паляпшэнне жыллёвых умоў. На прыёме грамадзян у сераду гучала пытанне і аб інклюзіўнай адукацыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Вы ведаеце, што пры Савеце Рэспублікі створаны кансультатыўны савет, які шчыльна займаецца гэтай тэмай. І звароты грамадзян прагучалі таксама ў адзіным рэчышчы з пытаннямі, што разглядаюцца Саветам Рэспублікі», — падкрэсліў Сяргей Бервін.

Са зваротам да Наталлі Качанавай звярнулася Крысціна Анатольеўна, якая прыехала з Жабінкі. Жанчына адна выхоўвае 7-гадовага сына-інваліда з трэцяй ступенню страты здароўя — аўтызмам. Бацька ў хлопчыка ёсць, але ён пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Жанчына расказала, што родных у яе няма і разлічваць можа толькі на сябе. Перад сям'ёй вельмі востра стаіць жыллёвае пытанне. Зараз Крысціна Анатольеўна разам з сынам жыве ў сяброўкі. Наталля Качанава даручыла знайсці сям'і зручнае жыллё, узяла сітуацыю на кантроль і запэўніла, што пастараецца максімальна дапамагчы ў гэтай сітуацыі. Праблема са сваім жыллём і ў жыхара Івацэвіч Ігара Мікалаевіча і яго шматдзетнай сям'і. Мужчына папрасіў дапамагчы ў атрыманні дзяржаўнай падтрымкі на будаўніцтва жылля — крэдыты на будаўніцтва ў сям'і ёсць, але яны не льготныя. Пытанне гэтае будзе разгледжана сумесна з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва і будзе вырашацца сумесна з банкаўскімі структурамі.

На ўсе прыёмы грамадзян у Савет Рэспублікі запрашаюцца прадстаўнікі адпаведных ведамстваў і арганізацый. Гэта робіцца для таго, каб людзей, якія прыязджаюць за сотні кіламетраў, не проста выслухалі, а адразу далі парады, кансультацыі і ўзялі на кантроль. Усе праблемы бярэ на свой асабісты кантроль і Наталля Качанава.

«Гэтую гісторыю я бяру на кантроль і цяпер буду яе каментаваць усюды. Чалавек лічыцца беспрацоўным, знаходзіцца на сацыяльным забеспячэнні, яго сям'я карыстаецца ўсімі сацыяльнымі дабротамі ў Беларусі. А ён насамрэч тым часам працуе за межамі краіны. Так быць не павінна», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, каментуючы праблему, з якой звярнулася жыхарка Бабруйска Ніна Аляксандраўна. Яна ўжо амаль пяць гадоў не можа спагнаць аліменты з былога мужа. Мужчына працуе ў Літве, мае заробак, але ў Беларусі лічыцца беспрацоўным, і аліменты на дзіця выплачвае як беспрацоўны. Наталля Качанава ўзяла гэту справу на асабісты кантроль і адзначыла, што сітуацыя будзе разглядацца сумесна з Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

Многія людзі прыязджаюць у Савет Рэспублікі за сотні кіламетраў. Але тыя, у каго няма такой магчымасці, усё роўна могуць звярнуцца па дапамогу. Старшыня і члены Савета Рсэпублікі рэгулярна праводзяць выязныя прыёмы грамадзян, тэлефонныя лініі. Добра сябе зарэкамендавалі адзіныя дні прыёму грамадзян з поўным ахопам пэўнага рэгіёна. У маі такое мерапрыемства прайшло ў Гомельскай вобласці. Кожны жыхар, не выязджаючы за межы свайго рэгіёна, меў магчымасць звярнуцца непасрэдна да прадстаўніка вышэйшага заканадаўчага органа. Такі фармат узаемадзеяння з насельніцтвам дае магчымасць аператыўна рэагаваць на існыя праблемы і, што яшчэ больш важна, папярэджваць прычыны іх узнікнення.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*З чым яшчэ прыходзілі людзі на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі — падрабязна ў наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».*

На кантролі

# «ВА ЎСІХ РАЁНАХ — УЛАСНЫМІ СІЛАМІ»

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў — упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці Ігар СЕРГЯЕНКА ў час рабочай паездкі ў рэгіён для кантролю ходу работ па ліквідацыі наступстваў урагану і ходу ўборачнай кампаніі наведаў Ушацкі і Полацкі раёны.**



Фота БелТА.

Гаворачы аб ліквідацыі наступстваў урагану, Ігар Сергяенка адзначыў: «Падпісана адпаведнае распараджэнне кіраўніка дзяржавы, дзе дакладна вызначаны задачы ўсім структурам: міністэрству лясной гаспадаркі, міністэрству энергетыкі, абласным выканаўчым камітэтам. Выдзелены канкрэтныя раёны, канкрэтныя напрамкі, сферы дзейнасці і абазначаны тэрміны». Па словах упаўнаважанага прадстаўніка кіраўніка дзяржавы, Віцебскую вобласць ураган закрануў менш за іншых. Але і тут ёсць пацярпелыя раёны, у прыватнасці Ушацкі. «Мы сёння паглядзелі, як праводзіцца работа па разборцы завалаў, буралому, як ажыццяўляецца санітарная высечка лесу. Ва Ушацкім раёне больш за 100 гектараў давядзецца ўбіраць. Гэта тое, што датычыцца лясной гаспадаркі. Абласным упраўленнем лясной гаспадаркі арганізавана работа. Ва ўсіх раёнах — уласнымі сіламі», — сказаў ён . Акрамя таго, у Віцебскай вобласці выдзелены дадатковыя людскія рэсурсы, тэхніка для работ у трох раёнах Гомельскай вобласці, звярнуў увагу старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Гаворачы аб сітуацыі ва Ушацкім раёне, Ігар Сергяенка адзначыў, што ўраган прайшоў па раёне кропкава. «Нязначны ўрон, але тым не менш летась Ушацкі раён таксама зачапіў невялікі ўраган. Фактычна мы ўжо вымушаны канстатаваць, што са змяненнем і клімату, і іншых, напэўна, абставін, якія ўплываюць у цэлым на прыроду, трэба быць гатовымі не толькі да ліквідацыі такіх наступстваў, але да таго, каб аператыўна рэагаваць», — адзначыў ён.

Ігар Сергяенка падкрэсліў, што ліквідацыя наступстваў стыхіі паказала зладжанасць дзеянняў: «На першапачатковым этапе, магчыма, недаацанілі і не зусім актыўна разгарнуліся, на што і ўказваў кіраўнік дзяржавы. Але ў цэлым паказана зладжанасць дзеянняў энергетыкаў, работнікаў лясной гаспадаркі. Па-баявому, як ваенныя людзі, арганізавалі работу».

Больш за тое, работа па пераадоленні наступстваў ураганных вятроў праявіла і найлепшыя чалавечыя якасці, дадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. Так, людзі бясплатна выходзілі на расчыстку завалаў, прычым не толькі ў лесе, у канкрэтных населеных пунктах, але і на могілках. «І тое, што сёння з Віцебскай вобласці накіраваны (у Гомельскую вобласць. — **«Зв.»**) спецыялісты і лясной гаспадаркі, і энергетыкі там працуюць, гэта таксама сведчыць аб узаемавыручцы і аб лепшых чалавечых якасцях», — падкрэсліў ён.

Як запэўнівае кіраўніцтва Ушацкага раёна, аднаўленчыя работы на аб'ектах сельгаспрызначэння будуць выкананы да 15 жніўня. Работнікі лясной гаспадаркі ўсе пастаўленыя задачы выканаюць да 1 лістапада.

Упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы таксама пракаментаваў, наколькі аператыўнымі былі дзеянні ўсіх, хто мае дачыненне да ўстаранення наступстваў урагану: «Трэба было ацаніць рэальную шкоду, вызначыць фронт работ, спланаваць, вылучыць для гэтага сродкі і арганізаваць дакладна працу, каб паэтапна, паслядоўна правесці ўсе аднаўленчыя работы. Можа, нейкія элементы збянтэжанасці былі ў асобных рэгіёнах, недаацэнкі сітуацыі. Але пасля, калі работы сталі набіраць абароты, усё стала нармальна».

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША за два гады праніклі каля 100 тэрарыстаў

Каля 100 чалавек, унесеных у спіс тэрарыстаў, патрапілі на тэрыторыю Злучаных Штатаў пры папушчальніцтве адміністрацыі прэзідэнта ЗША Джо Байдэна і віцэ-прэзідэнта Камалы Харыс. Пра гэта паведаміў тэлеканал Fox News са спасылкай на даклад юрыдычнага камітэта Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША, які апынуўся ў яго распараджэнні. Паводле дакумента, гэтыя даныя не ўлічваюць «незлічоную колькасць патэнцыйных тэрарыстаў» сярод амаль двух мільёнаў чалавек, якія «выслізнулі ад памежнай службы» з моманту прыходу да ўлады адміністрацыі Байдэна і Харыс. Раней былы амерыканскі лідар і кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Дональд Трамп заявіў, што ў выпадку перамогі ў перадвыбарнай гонцы Харыс, якая таксама прэтэндуе на вышэйшую дзяржаўную пасаду краіны, «адкрые границы і разбурыць краіну».

### Малайзія мяркуе стаць адным з сусветных лідараў у вытворчасці мікрасхем

Улады Малайзіі маюць намер нарасціць маштабы вытворчасці інтэгральных мікрасхем (ІМ), каб стаць адным з сусветных лідараў тэхналагічнай галіны. Аб гэтым заявіў міністр эканомікі краіны Рафізі Рамлі падчас цырымоніі адкрыцця нацыянальнага Парка распрацоўкі паўправадніковых ІМ, паведаміла ТАСС. «У Міністэрстве эканомікі ў нас ёсць некалькі ініцыятыў, накіраваных на распрацоўку ІМ і павелічэнне маштабаў іх вытворчасці», — прыводзіць яго цытату мясцовая газета Malay Mail. Паводле яго слоў, улады краіны хочуць зрабіць Малайзію «такой жа вядомай у тэхналагічнай галіне, як і цяперашнія гіганты індустрыі». Рамлі падкрэсліў, што для малайзійскага кіраўніцтва недастаткова, каб тавары былі проста зроблены ў краіне замежнымі кампаніямі. Тэхналагічная прадукцыя «павінна быць выраблена самой Малайзіяй».

### У Японіі стварылі спосаб віртуальна «перажыць» бамбардзіроўку Хірасімы



Праект распрацавала кампанія Tabimachi Gate Hiroshima, паведаміла РІА «Новости». У 2021 годзе ўсё пачыналася з пілотнага праекта, а летась было прадстаўлена відэашэрагам працяглацсю ў некалькі хвілін на выставе ў рамках саміту лідараў краін G7, пасля трансфармавалася ў 80-хвілінны тур па ключавых месцах хірасімскага Мемарыяльнага парку міру, даступны для ўсіх ахвотных не толькі на японскай, але і англійскай мовах. З дапамогай гарнітуры віртуальнай рэальнасці чалавек атрымлівае магчымасць не толькі перажыць жахі бамбардзіроўкі, але і прасачыць працэс аднаўлення горада да яго цяперашняга віду. У жніўні 1945 года амерыканскія пілоты скінулі атамныя бомбы на японскія гарады Хірасіму і Нагасакі. Ад атамнага выбуху і яго наступстваў у Хірасіме загінулі каля 300 тысяч чалавек, у Нагасакі — 165 тысяч. Пераважная большасць ахвяр атамнай бамбардзіроўкі — мірныя жыхары.

# «ЗАХАВАЦЬ І ПЕРАПРАЦАВАЦЬ БЕЗ СТРАТ»

**Раман ГАЛОЎЧАНКА агучыў мэты і задачы, якія стаяць перад Магілёўскай вобласцю і краінай у цэлым**

**Пераадольванне наступстваў стыхіі стала нагодай для візіту прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі ў Быхаўскі раён. На тэрыторыі Магілёўскай вобласці гэты раён больш за астатнія пацярпеў ад урагану. Пытанне разглядалася на базе лесасекі паблізу пасёлка Адаменка з удзелам кіраўніцтва Магілёўскага аблвыканкама і Быхаўскага райвыканкама, міністра лясной гаспадаркі Аляксандра Куліка, старшыні канцэрна «Беллеспапераправ» Аляксандра Пшоннага, іншых зацікаўленых асоб.**

Па даных на 5 жніўня, ад буралому ў Быхаўскім раёне пацярпела больш за 5 тысяч гектараў лесу, з іх на плошчы больш за 2 тысячы гектараў лес падлягае суцэльным санітарным высечкам і на амаль трох — уборцы ад захламлённасці. У планах да 1 кастрычніка — ліквідаваць усе наступствы па суцэльных санітарных рубках, да 1 лістапада — па суцэльных санітарных рубках у цяжкадаступных забалочаных месцах, да 1 лютага — справіцца з уборкай лесу ад захламленасці ў глыбіні масіваў. У бліжэйшыя паўтара года на гэтых плошчах павінна ісці лесааднаўленне.

Заданне будзе выканана ў тэрмін, паабяцаў **міністр лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК,** які расказаў аб сітуацыі па ліквідацыі наступстваў стыхіі.

— Аб'ём вялікі, парадку 6 мільёнаў кубаметраў лесу пашкоджана ў адпаведнасці з апошнім абследаваннем, — падкрэсліў ён. — Лічба 20 тысяч гектараў раўназначная той, якая была ў 2016 годзе пасля ўрагану ў раёне Смалявіч і Чэрвеня. 1,5 тысячы гектараў мы ўжо распрацавалі, працэс працягваецца. Па Магілёўскай вобласці праблем не бачым, тут дастаткова і тэхнікі, і людзей. Цяпер вызначаем, колькі сіл і сродкаў трэба накіраваць у Гомельскую вобласць, каб даручэнне Прэзідэнта было выканана да 1 лістапада. Вялікі плюс у тым, што ёсць куды рэалізоўваць драўніну розных асартыментаў. Мы просім прэм'ер-міністра толькі ўмацаваць тэхнічны бок справы. Ёсць пытанні да якасці тэхнікі і пастаўкі вагонаў. У астатнім ўсё вырашаецца на месцах, мы працуем у поўным узаемадзеянні з мясцовымі органамі ўлады і іншымі міністэрствамі.

Аляксандр Кулік адзначыў, што сёння галоўнае мінімізаваць страты драўніны. У краіне адрэгуляваны біржавы гандаль і пытанняў з рэалізацыяй драўніны не павінна быць. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што трэба загадзя паклапаціцца пра восеньскае пахаладанне і неабходнасць стварыць ўмовы для людзей, якія працуюць на ліквідацыі наступстваў буралому. Забяспечыць іх стацыянарнымі ўмовамі пражывання, бо сёння шмат хто жыве ў вагончыках і палатках. Што датычыцца харчавання, выплаты камандзіровачных, годнай зарплаты, то тут, па словах міністра, праблем няма.

**Старшыня канцэрна «Беллеспапераправ» Аляксандр ПШОННЫ** адзначыў, што прадпрыемствы канцэрна гатовыя засвоіць той аб'ём драўніны, які трэба перапрацаваць.

— Будзе зроблена цэлюлоза, фанера, ДБП, драўляныя канструкцыі, іншая прадукцыя, якая пойдзе як мінімум у 43 краіны свету, з якімі мы гандлюем, — паведаміў ён. — У асноўным гэта Расійская Федэрацыя, Кітай, краіны Сярэдняй Азіі, Узбекістан, Азербайджан, Казахстан. У год мы перапрацоўваем каля 7 мільёнаў кубаметраў, непагадзь сапсавала каля 6 мільёнаў. Думаю, да канца года мы зможам перапрацаваць неабходны аб'ём.

Аляксандр Пшонны звярнуў увагу толькі на адзін нюанс. Для вытворчасці фанеры патрэбна здаровая драўніна і ён заклапочаны тым, каб яе нарыхтоўка не прыпынялася.

— Мы, вядома, бярэм самую нізкаякасную драўніну, але для вытворчасці фанеры патрэбна выключна здаровая, — заўважыў ён. — Бураломная драўніна, калі адбываецца стыхія, мяняе сваю структуру, энергетыка ўнутраных яе сувязяў мяняецца. Гэта адбіваецца на якасці фанеры. Таму абавязкова трэба пакінуць частку людзей, якія будуць не бураломам займацца, а працаваць на карысць нарыхтоўкі фанеры.

У размове з журналістамі **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** рэзюмаваў:

— Мы сістэмна праводзім работу, усё павінна быць максімальна выкарыстана, але спачатку трэба навесці парадак у лесе — вывезці, перапрацаваць і прадаць прадукцыю, а затым аднавіць лес. Усе аб'ёмы будуць выкарыстаныя ў прамысловай вытворчасці, ніякіх праблем з гэтым няма. Светлагорскі цэлюлозны камбінат выйшаў практычна на праектную магутнасць, і пытання, на якія прадпрыемствы пойдуць тыя 6 мільёнаў кубаметраў, не стаіць. Асноўная праблема, якая вырашаецца, — гэта аператыўна ўсё зрабіць і не дапусціць псавання драўніны, паколькі сёння на вуліцы то вільготна, то горача. На ліквідацыю наступстваў стыхіі кінутыя ўсе сілы. І даручэнне трэба выканаць не фармальна, а з добрым эканамічным эфектам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*Быхаўскі раён.*

Жніво-2024

# Іх місія — карміць хлебаробаў

**Часта за шматлікімі навінамі аб чарговых дасягненнях галоўных герояў уборачнай — камбайнераў і кіроўцаў — застаюцца ў цені іншыя людзі, якія таксама задзейнічаны ў жніве. А іх роля без перабольшання не меншая: накарміць кожнага хлебароба, каб у яго былі сілы ад відна да відна забяспечваць харчовую бяспеку краіны. Дзякуючы акцыі «Жанчыны за ўраджай», якую ініцыіравала Віцебская абласная прафсаюзная арганізацыя работнікаў АПК, дэпутаты і мясцовыя органы ўлады могуць выказаць шчырыя словы падзякі прыгожай палавіне чалавецтва, якая ў ролі байцоў нябачнага фронту ўсебакова падтрымлівае аграрыяў.**

На гэтым тыдні добрая акцыя дайшла да Гарадоцкага раёна. З дыпломамі і каштоўнымі падарункамі да работнікаў сталовых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Гарадочыны прыехалі **прафсаюзны лідар аграрыяў вобласці Тацяна ДЗІКАНАВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэй БАЛЫШ і старшыня райвыканкама Ірына ПАЛЯКОВА.**

Ва ўтульнай сталовай ААТ «Птушкафабрыка «Гарадок» сёлета віншавалі ўсіх членаў невялікага, але зладжанага калектыву. Старшы кухар Тацяна Цяпкова працуе на птушкафабрыцы з 2008 года, а ў прафесіі жанчына ўжо 33 гады. У шырокім меню сталовай, у якой штодзень гатуюць каля 100 абедаў, нямала амаль рэстаранных пазіцый: мясныя «гнёзды», фаршыраваныя грыбамі; рыба, запечаная з агароднінай; свініна «Апетытная». Яшчэ блінчыкі з мясам, некалькі найменняў катлет, дзеруны, каля пяці відаў супоў. І, вядома, выдатныя булачкі, якія, па словах старшыні раёна, самыя смачныя ва ўсёй Віцебскай вобласці.

Сёння, прызнаецца Тацяна Цяпкова, развозіць гарачыя абеды і вячэры стала значна прасцей. Раней першую страву прывозілі на поле ў адным вялізным бачку, разлівалі супы на месцы. А цяпер для кожнага аграрыя рыхтуюць кантэйнер з індывідуальнай порцыяй.

Звяртаючыся да жанчын, дэпутат Андрэй Балыш адзначыў, што заўсёды ўшаноўваюць тысячнікаў і двухтысячнікаў, але тая работа, якую робяць гэтыя жанчыны, не менш значная. «Калі аграрыі накормлены, тады і працаваць хочацца, паказваць вынікі. Таму шчыры дзякуй за вашу нялёгкую працу, жадаю моцнага здароўя, нахтхнення і дабрабыту», — сказаў Андрэй Іванавіч.

Прыемнай нечаканасцю для работніц сталовай філіяла «Віраўлянскі» ІП «Дзецкасельскі гарадок» стала вялікая ўвага да, здавалася б, звычайнай прафесіі. Штодзень з-пад клапатлівых жаночых рук тут выходзяць 120 абедаў і 50 вячэр. **Загадчык сталовай Тацяна ФІЛІПСКАЯ**, якая нарадзілася і ўсё жыццё працуе ў Віроўлі, адзначае, што іх справа — вельмі адказная і ганаровая. «Ад нашай работы залежаць намалоты механізатараў і дасягненні ўсіх астатніх, бо мы кормім не толькі ўдзельнікаў жніва, але і жывёлаводаў, будаўнікоў — усю гаспадарку», — расказвае Тацяна.

Падчас віншаванняў у кухараў і раздатчыкаў абедаў на вачах праступалі слёзы. У адзін голас жанчыны прызнаваліся, што іх не часта песцяць увагай, таму такія каштоўныя хвіліны даюць дадатковыя сілы і натхненне, даказваюць, што работніцы сталовай таксама робяць многае дзеля агульнага каравая.

**Раздатчыка абедаў СУП «Паўночны» Варвару КЛІМОВІЧ** віншавалі ад абласнога прафсаюза работнікаў АПК заспелі проста ў машыне, у кароткім перапынку паміж пераездамі. Рыжавалосая працаўніца з шырокай усмешкай, здаецца, зараджае пазітывам усіх навокал. Варвара прыйшла ў гаспадарку ў 2017 годзе, амаль адразу яе выправілі развозіць абеды аграрыям. «Спачатку было страшна, але дапамаглі калегі, патлумачылі. А потым уцягнулася, цяпер штодзень выпраўляюся ў падарожжа па Гарадоччыне», — расказвае гераіня. Дарэчы, за дзень яна разам з кіроўцам намотвае да 200 кіламетраў.

Шчырая дзяўчына прызнаецца, што спецыяльна дадаткова заказвае абед для сябе і да самага канца дня яго не чапае: гэта на выпадак, калі камусьці не хопіць гарачай порцыі. Калі чалавек адмаўляецца ад часткі абеда, яна прапаноўвае дадатковую катлету або булачку іншаму аграрыю. «Галоўнае — каб усе былі сытыя. Хоць вопыт ужо ёсць, але ўсё роўна перажываю кожны дзень», — дзеліцца Варвара.

«Ведаеце, абеды не былі б такімі смачнымі, калі б вы не дадавалі ў іх часцінку сваёй душы і любові. Вялікі дзякуй за ваш прафесіяналізм і адданасць сельскай гаспадарцы», — звярнулася да дзяўчыны Тацяна Дзіканава і ўручыла каштоўны падарунак.

Па словах прафсаюзнага лідара аграрыяў вобласці, кожнаму працаўніку важна адчуваць сябе карысным. І часцей маральная падтрымка і стымуляванне ў выглядзе такіх акцый даюць не менш значны вынік, чым фінансавае заахвочванне.

У гарачую пару жніва прафсаюзы заўсёды знаходзяцца побач з аграрыямі, акрамя кантролю за захаваннем умоў працы, яны дапамагаюць зрабіць іх больш камфортнымі. Так, Віцебская абласная прафсаюзная арганізацыя работнікаў АПК уручае гаспадаркам вобласці сертыфікаты на набыццё тонометраў, каб працаўнікі маглі своечасова правяраць ціск і пераканацца ў стане здароўя. З першага ліпеня працуе гарачая лінія прафсаюза па пытаннях арганізацыі і ходу ўборачнай кампаніі.

Акцыя «Жанчыны за ўраджай» працягвае крочыць па гаспадарках паўночнага рэгіёна. Віншаванні ўжо прымалі ў Докшыцкім, Глыбоцкім і Гарадоцкім раёнах.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Па сутнасці



# «А ШТО ТЫ ЗРАБІЎ ДЛЯ РАДЗІМЫ?»

Ці памятаем мы родныя творы, сваіх герояў, сэнсы ад светачаў беларускай думкі? Мы, зразумела, чытаем. Але што і каго? Трэба ведаць класіку, сучасных модных творцаў. Чалавек вачыма павінен азіраць увесь свет, але нагамі цвёрда стаяць на роднай зямлі. А то, атрымліваецца, у чужых брэндах і гісторыі разбіраемся лепш, чым у сваіх. Не, вядома, мы павінны быць уключаны ў гэты міжнародны дыялог, у стасункі той непазбежнай глабалізацыі. Зараз ініцыятыву у Захада перахоплівае глабальны Поўдзень. Але ж пачакайце, трэба не згубіць смак роднага хлеба. І калі мы кажам — «глабалізацыя», дык чаму мы паглынаем, аж вушы трашчаць, імпартныя ідэі, а не іншыя — нашы?

А мы ўжо ў некаторых пытаннях збочылі з гасцінца, што дзеля нас церабілі нашы продкі. І зараз не пра глыбіннае, не пра тых, хто спачатку страціў Беларусь у сваім сэрцы, а потым і ўвогуле з'ехаў. Гэта пытанне хутчэй не палітычнае, як падаецца адразу — яно больш сацыяльнае і ментальнае. Людзі апантана аддалі свае сэрцы іншай мадэлі развіцця. Вось вам і прычына той зацятай «неверагоднасці»... А што мы? Тыя, хто засталіся, хто шчыра лічыць, што любіць сваю краіну, што працуе дзеля яе росквіту? Ці ўсе мы такія ўжо сапраўдныя беларусы? Наколькі мы падобныя на нашых продкаў у іх найлепшых якасцях? Даруйце, але ў некаторых нават паміж імі і бацькамі — бездань. А жывём жа фактычна ў тых жа аб'ектыўных рэаліях, што і папярэднія пакаленні. У нас, як і было заўсёды, няма незлічоных запасаў вуглевадародаў, мы не скваліся на багацці іншых народаў і краін. Нас заўжды заўзята «лашчылі» вогнішчы войн, ды і сёння знаходзімся на самым геапалітычным разломе. Але ж выжылі, і ўсё, што сёння маем, маем дзякуючы шчырай працы. Бацькоў, дзядоў, іх дзядоў і прадзедаў. А выстаяць усім пакаленням дапамаглі спагада і талака.

І вось менавіта ў гэтым, самым важным, жыццесносным, некаторыя з нас і адрозніваюцца ад старэйшых. Страшэнны віхор, які пранёсся над Палессем у сярэдзіне ліпеня, яскрава гэта паказаў.

Не, дзякуй Богу, аднаўляемся. Дзяржава дапамагла чалавеку. Пра чыстку завалаў і казаць не прыходзіцца. Першы аднымі нарадамі не абышоўся. Інспекцыя, жывыя дыялогі з людзьмі, кантроль. Працэс аднаўлення наладжаны. Тэхналагічны канвеер. Там чутны пілы, там стук малаткоў. Над Палессем гучыць мелодыя жыцця. Дзяржава, палітыка Прэзідэнта ў дзеянні. З прыроднымі выклікамі так канкрэтна не ўмеюць працаваць самыя апеты Галівудам краіны. Тыя здымаюць фільмы-катастрофы. З хэпі-эндам. А мы канкрэтна вырашаем праблемы людзей. Гэта і ёсць сацыяльна арыентаваная дзяржава. Дапамагаць сваім людзям. Толькі вось... Калі казаць не пра дзяржаву, а пра людзей, пра нас з вамі... Ці шмат, асабліва ў першыя гадзіны пасля ўрагану было добраахвотнікаў з бензапіламі і сякерамі ў руках? Ці многія сказалі такую сакраментальную ў 2020-м фразу «Я выходжу»? А гэта і ёсць паказчык нацыянальнага духу. Дзякуй богу, сёння не трэба паміраць за краіну на фронце. Дастаткова — не прайсці міма, дапамагчы. Не пагардлівым каментарыем у сецiве, седзячы на канапе, а зрабіць штосьці карыснае. Лайкаць тым і тых, хто крытыкуе ўсё і ўсіх, безумоўна, прасцей... І нездарма Прэзідэнт на нарадзе сказаў пра свае прэтэнзіі як кіраўніка краіны да грамадзян гэтай самай краіны: «Людзі не жадаюць разумець, што гэта надзвычайная сітуацыя. Вайна проста, толькі няма стральбы з аўтаматаў і кулямётаў. Тое ж самае, што на вайне. І ніхто не задаецца пытаннем: а што я сам зрабіў для таго, каб пераадолець гэтую катастрофу?» Хтосьці запярэчыць: маўляў, колькі людзей выйшла на дапамогу спецыялістам. Але ж і тых, хто і сёння і пальцам не варухне, чакаючы, што ўлады вырашаць усе праблемы, не мала.

Мы ж не з тых, хто ад праблем хаваецца. Беларусь — краіна дужых зуброў, а не страусаў. Крытыкаваць і проста чакаць, што хтосьці штосьці зробіць — няўжо гэта пра нас? Няўжо ў беларусаў змяншаецца прага да жыцця, да дзеяння? Абыякавасць, асабліва падчас выпрабаванняў — індыкатар стаўлення да Радзімы. І — да саміх сябе?

Не трэба траціць свае адметныя рысы. Наш сапраўдны беларускі дух. Мы не тыя людзі, якія самасцвярджаюцца за кошт іншых. Мы талакой любыя перашкоды прывучаныя пераадольваць. Калі капнуць глыбей — то гэта ж і ёсць стрыжнёвы элемент нас як супольнасці людзей. Калі разам — то і ад ворага ачысцім нашу зямлю (а лепей — не пусцім яго сюды), і дарогі ад завалаў. Так і зберажом наш беларускі свет — і як стан унутры краіны, і як геапалітычную з'яву...

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Надзейная платформа

## «ПРАЗ ЦЫВІЛІЗАВАНЫ САЦЫЯЛЬНЫ ДЫЯЛОГ»

***— Гэты год для Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — асаблівы. Адзначаецца 120-годдзе прафсаюзнага руху. Які шлях быў пройдзены, чаго ўдалося дасягнуць?***

— Беларускія прафсаюзы — адны з найстарэйшых у свеце. Пункт адліку — 1904 год. Менавіта тады пачалося масавае стварэнне прафсаюзаў. Яны сфарміраваліся практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі. Прафсаюзы ўтварыліся на пратэснай хвалі — у адказ на нечалавечыя ўмовы працы, адносіны да работнікаў.

Шлях быў пройдзены каласальны — сёлета мы адзначаем 120-годдзе прафсаюзнага руху. Мы ганарымся тым, што гэта супадае з найважнейшымі для нашай краіны датамі, сярод якіх — 80-годдзе вызвалення Беларусі, 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва. За мяжой прафсаюзы дагэтуль працуюць у пратэсным фармаце. А ў нашай краіне сфарміравалася ўнікальная сістэма, якая дазваляе праз цывілізаваны сацыяльны дыялог вырашаць усе неабходныя пытанні. Гэта гістарычнае дасягненне і становчая адметнасць Беларусі. Прэзідэнт яшчэ ў сваёй першай перадвыбарнай праграме заявіў, што ў цэнтры ўвагі заўжды будзе чалавек працы. І за ўсе гады ніколі не адмовіўся ад гэтага абяцання, а паступальна ўвасабляў яго ў жыццё. Беларусь насамрэч дзяржава для народа, гэта пацвярджаецца рэальнымі фактамі.

У 1995 годзе кіраўнік дзяржавы падпісаў адзін з найважнейшых у сферы працоўных адносін указаў, у якім прапісана комплекснае, паслядоўнае развіццё сістэмы сацыяльнага партнёрства. З таго часу ўсе ключавыя пытанні абмяркоўваюцца з удзелам прафсаюзаў. Інстытут сацыяльнага партнёрства развіўся ў разуменні грамадства — па-іншаму нельга. І гэта вельмі правільна.

30-годдзе інстытута прэзідэнцтва, якое мы таксама адзначаем сёлета, — гэта ў сукупнасці ўся тая праца, якая была зроблена за гэты час. Дзякуючы тым падыходам, якія кіраўнік дзяржавы сістэмна, дакладна выбудаваў у нашай краіне, у тым ліку і прафсаюзы атрымалі магчымасць наладзіць плённае ўзаемадзеянне з органамі дзяржаўнага кіравання праз дыялог. Усе важныя рашэнні ў нашай краіне прымаюцца з удзелам прафсаюзаў, паколькі яны так ці інакш датычацца чалавека працы, яго інтарэсаў. Мы маем права і магчымасць вызначыць сваю пазіцыю па тым ці іншым кірунку, і нас чуюць. Рэгулярна праходзяць пасяджэнні трохбаковага Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, калі ўрад, прафсаюзы і наймальнікі збіраюцца разам для вырашэння важных задач. Падпісваецца рашэнне, якое абавязковае для выканання ўсімі бакамі. Гэтаму папярэднічаюць сур'ёзныя дэбаты экспертаў, якія збіраюцца на сваім узроўні. Яны абмяркоўваюць дэталі наконт таго, якім чынам можа развівацца сітуацыя пасля прыняцця таго ці іншага рашэння. Пошук аптымальнага рашэння ў рэжыме рэальных кантактаў паміж трыма бакамі — вельмі важная і эфектыўная форма ўзаемадзеяння.

***— Якім чынам прафсаюзы ўцягнутыя ў заканатворчую дзейнасць?***

— Прафсаюзы вельмі ўважліва ставяцца да таго, каб нарматыўна-прававы акт, які будзе надалей працаваць, стаў стымулюючым элементам для работніка па заработнай плаце, адпачынку, сацыяльных гарантыях і іншых важных пытаннях, і ні ў якім разе не пагоршыў становішча чалавека працы. З падачы Федэрацыі прафсаюзаў вырашаюцца многія надзённыя пытанні. Сярод апошніх прыкладаў — па нашай прапанове з гэтага года маладым спецыялістам прадастаўляецца спецыяльны падатковы вылік. Паўная частка ў заработнай плаце такіх работнікаў не абкладаецца падаткам. У выніку, калі палічыць за год, то кожны малады спецыяліст дадаткова атрымлівае каля тысячы рублёў.

З мінулага месяца зменены падыходы па выплаце «бальнічных». Удзел у распрацоўцы адпаведнага дакумента брала і Федэрацыя прафсаюзаў. І сённяшні вырашана пытанне, якое ФПБ узнімала неаднаразова. Размова ідзе аб памеры выплат па бальнічных лістах для маладых работнікаў, у якіх працоўны стаж менш за паўгода. З ліпеня, з моманту ўступлення дакумента ў дзеянне, гэтыя выплаты павялічыліся практычна ўтрая.

***— Адно з надзённых пытанняў — удасканаленне падыходаў па выплаце пенсій работнікаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту і працягваюць працаваць...***

— Нярэдка здараецца сітуацыя, калі чалавек дасягае пенсійнага ўзросту, але ён поўны сіл і жадання працягваць працаваць. Такіх у нас шмат. У гэтых работнікаў высокая кваліфікацыя і вялікі вопыт. Яны запатрабаваныя спецыялісты ў сваёй справе. Але людзі становяцца перад выбарам, паколькі недаатрымліваюць поўныя сумы сваёй пенсіі. Калі казаць простымі словамі, то сёння памер пенсіі залежыць, па сутнасці, ад двух складнікаў — гэта стаж працы чалавека і яго заробак, які ўлічваецца для вызначэння індывідуальнага каэфіцыента па пэўнай схеме. І чым большы стаж працы і вышэйшы індывідуальны каэфіцыент, тым, адпаведна, і вышэйшы памер прызначанай пенсіі. Аднак пенсія працуючым пенсіянерам выплачваецца з абмежаваннем індывідуальнага каэфіцыента 1,3. Тым самым пенсіянеры, у якіх пры назначэнні пенсіі індывідуальны каэфіцыент склаў вышэй за 1,3, атрымліваюць пенсію ў перыяд работы не ў поўным аб'ёме. Хтосьці губляе некалькі дзясяткаў рублёў, а ў кагосьці даходзіць і да некалькіх сотняў. Прафсаюзы неаднаразова падымалі гэтае пытанне і настойвалі: падыходы трэба змяніць. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прафсаюзы і даручыў распрацаваць праект дакумента, які дасць магчымасць зняць абмежаванні па выплаце пенсій працуючым пенсіянерам. Такая работа вядзецца і ў трэцім квартале павінна быць завершана.



## «ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ КАЛЯ 18 ТЫСЯЧ КАЛДАГАВОРАЎ»

***— Якія станоўчыя змяненні закладваюцца ў калектыўныя дагаворы?***

— Калектыўныя дагаворы, якіх у нашай краіне ўжо дзейнічае каля 18 тысяч, прайшлі праз эвалюцыю. Калі раней наймальнікі даволі асцярожна ставіліся да іх заключэння, то цяпер мы маем вопыт маштабнага выкарыстання. Ніхто не бачыць пагрозы, наадварот, наймальнік глядзіць на калектыўны дагавор як на дадатковы элемент стымулявання кадраў для забеспячэння стабільнай работы — належныя вынікі працы, якасць. Са свайго боку работнік разумее, што гэта прэміі, дадатковы адпачынак, іншыя важныя элементы, якія прапісаны ў калдагаворы. З адпаведным настроем чалавек і працуе. Адзін бок атрымлівае дывідэнды ў выглядзе сацыяльных ільгот, гарантый, другі — эфект у дасягненні вынікаў. Усё гэта ў рэшце рэшт працуе на карысць грамадства.

Пры заключэнні кожнага з калектыўных дагавораў адміністрацыя арганізацыі і прафкам арыентуюцца на Генеральнае пагадненне паміж урадам, аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў, а таксама пагадненне, заключанае ў адпаведнай галіне. Выбудавана дакладная сістэма: галіновае пагадненне вызначае, які мінімум гарантый павінен быць закладзены ў кожнай арганізацыі. Іншымі словамі, ёсць абавязковы мінімум, максімум вызначаецца на месцы. Гэта самыя розныя пазіцыі — ад абавязацельстваў наймальніка падаўжаць працоўныя адносіны тым ці іншым катэгорыям работнікаў да розных выплат і прадастаўлення дадатковых дзён водпуску. Прычым усе гэтыя нормы — абавязковыя да выканання. Напрыклад, больш за 87 працэнтаў ад агульнай колькасці калдагавораў змяшчаюць дадатковыя меры падтрымкі моладзі, сярод якіх — розныя даплаты, заахвочванні і гэтак далей. Звыш 60 працэнтаў вызначаюць меры па вырашэнні жыллёвага пытання для работнікаў (прадастаўленне інтэрната, арэнднага жылля, выплата матэрыяльнай дапамогі на аплату арандаванага жылля і інш.). Каля 80 працэнтаў калдагавораў прапісалі даплаты на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне, а таксама патанненне пуцёвак на санаторна-курортнае аздараўленне работнікаў. Такая ж доля дагавораў прадугледжвае розныя нормы па стварэнні ў арганізацыях спрыяльных умоў для работнікаў з сямейнымі абавязкамі — дадатковыя выхадныя дні, дапамогу ў аздараўленні дзяцей, да падрыхтоўкі да школы і іншыя бонусы.

***— Прававая абарона і юрыдычная дапамога работнікам — адзін з асноўных кірункаў дзейнасці прафсаюзаў. Як ажыццяўляецца гэтая работа?***

— За дапамогай прафсаюзных юрыстаў можна звярнуцца па тэлефоне, на асабістым прыёме або праз спецыяльны сэрвіс на інтэрнэт-партале ФПБ, пакінуць пісьмовы ці электронны зварот. Акрамя таго, кожны месяц прафсаюзныя юрысты непасрэдна ў раёнах, на прадпрыемствах і арганізацыях кансультуюць і аказваюць неабходную дапамогу па пытаннях, звязаных з працоўным, пенсійным, жыллёвым заканадаўствам. Ніводны зварот не пакідаем без увагі.

Напрыклад, у Гомельскай вобласці на такім прыёме два работнікі звярнуліся наконт аднаразовай выплаты. Пытанне датычылася прымянення на практыцы пастановы ўрада, якая рэгулюе пытанні заключэння кантрактаў з шэрагам катэгорый работнікаў, якія працуюць у раёнах, што былі забруджаны ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У прыватнасці, дакументам прадугледжана выплата аднаразовай дапамогі такім катэгорыям работнікаў. Аднак у выпадку з работнікамі, якія прыйшлі на прававы прыём, наймальнік палічыў, што не павінен аказваць такую дапамогу. Юрыст прафсаюза работнікаў аховы здароўя, які вёў гэты прыём, дэталёва вывучыў сітуацыю, прапрацаваў пытанне з органамі дзяржаўнага і мясцовага кіравання, і ў выніку спрэчка была вырашана ў дасудовым парадку — работнікам выплацілі па 200 базавых велічынь кожнаму.

Часам здараюцца сітуацыі, калі наймальнік адмаўляецца выконваць норму закона. Тады разам з работнікам ідзем у суд і там адстойваем яго правы. Як правіла, гэта сітуацыі, звязаныя з незаконным звальненнем работнікаў, неправамерным накладаннем дысцыплінарных спагнанняў, нявыплатай розных кампенсацый, узнагароджанняў і г. д. Напрыклад, урачхірург адной з бальніц Мінскай вобласці быў звольнены ў сувязі з тым, што скончыўся тэрмін дзеяння кантракта. Спецыяліст хацеў прадоўжыць працаваць і прыйшоў па дапамогу ў прафсаюзы. Юрыст прафсаюза работнікаў аховы здароўя дэталёва вывучыў сітуацыю. Аказалася, звальненне незаконнае. Справа ў тым, што ўрачу да пенсіі заставалася ўсяго тры гады. А Пагадненне паміж галоўным упраўленнем па ахове здароўя Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і Мінскай абласной арганізацыяй Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя дакладна вызначае, што наймальнік абавязаны прадаўжаць кантракты работнікам, якім засталося тры і менш гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Прадстаўнік прафсаюза дапамог работніку скласці іскавую заяву ў суд аб аднаўленні на рабоце на ранейшай пасадзе і спагнанні на яго карысць сярэдняга заробку за час вымушанага прагулу. У выніку разгляду справы ў судзе работнік быў аднаўлены на ранейшым месцы працы. Акрамя таго, наймальнік выплаціў яму звыш 4 тысяч рублёў за час вымушанага прагулу і пакрыццё маральнай шкоды ў памеры 300 рублёў.

Яшчэ прыклад. На сённяшні дзень практычна 76 працэнтаў ад усіх калектыўных дагавораў змяшчаюць норму аб дадатковых, звыш устаноўленага заканадаўствам, выплатах сям'і загінулага на вытворчасці па віне наймальніка работніка. Сумы значныя: не менш за 10 гадавых заробкаў загінулага. Аднак у асобных выпадках наймальнікі па тых ці іншых прычынах адмаўляюцца выплачваць гэтыя сродкі. У такіх сытуацыях прафсаюзы абараняюць інтарэсы людзей у судах. Напрыклад, у Дзятлаўскім раёне інтарэсы сям'і работніка, які загінуў на вытворчасці, адстойваў у судзе галоўны прававы інспектар працы прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу. На падставе норм калектыўнага дагавора арганізацыі, мясцовага і галіновага пагадненняў суд абавязаў наймальніка выплаціць на карысць сям'і загінулага работніка звыш 74 тысяч рублёў.

## «РЭАКЦЫЯ НА ЗАЎВАГІ ПРАФСАЮЗАЎ ВЕЛЬМІ ХУТКАЯ»

***— Чым характарызуецца сітуацыя ў плане гарантавання бяспекі на вытворчасці?***

— Тут прафсаюзы выступаюць своеасаблівым кантралёрам: дакладна адсочваем, ці ўсё зроблена з боку наймальніка, каб работніку былі гарантаваны бяспечныя ўмовы працы. Гэта і сродкі індывідуальнай аховы, і аптэчкі, і агульны стан тэхнікі. Абавязкова, калі патрэбна па рэжыме работы, адпаведнае харчаванне, адпачынак, вада, кандыцыянеры. Усе тыя ўмовы, якія сёння сучаснаму работніку павінны быць забяспечаны. Зараз любы наймальнік цудоўна разумее, што гэта надзвычай важна. Калі неабходна своечасова выправіць сітуацыю, то прафсаюзы падключаюцца, і ўсё вырашаецца належным чынам. Рэакцыя на нашы заўвагі вельмі хуткая.

Так, за першае паўгоддзе тэхнічнымі інспектарамі працы ФПБ выяўлена каля 29 тысяч парушэнняў заканадаўства аб ахове працы. Абсалютная большасць з іх пасля выдачы прафсаюзамі адпаведных рэкамендацый аператыўна ліквідавана наймальнікамі. Сярод найбольш распаўсюджаных парушэнняў — недахопы ў арганізацыі працоўных месцаў, адсутнасць ці няякасная распрацоўка інструкцый па ахове працы, парушэнні пры правядзенні навучання па адпаведных пытаннях, незабеспячэнне работнікаў сродкамі індывідуальнай абароны, адсутнасць неабходных санітарна-бытавых умоў.

***— Як ажыццяўляецца маніторынг цэн і тарыфаў, наколькі іх рост суадносіцца з ростам заробку?***

— Прафсаюзы даўно задзейнічаны ў маніторынгу цэн, кіраўнік дзяржавы падтрымаў гэтую нашу ініцыятыву. Мы ажыццяўляем своеасаблівы «народны» кантроль. Ён у першую чаргу датычыцца недахопу тых ці іншых таварных пазіцый на паліцах крамаў. Наша задача — кантраляваць належнае забеспячэнне людзей належным асартыментам па даступных цэнах. Цяпер гэта перыядычны тэматычны кантроль, і будзем надалей гэтым займацца. Гэта вельмі важна, і нашы спецыялісты разумеюць адказную задачу.

***— Якія магчымасці ў работнікаў і іх дзяцей па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні?***

— Сістэма прафсаюзнага аздараўлення захавалася яшчэ з савецкіх часоў, мы ўдзячны кіраўніку дзяржавы, які падтрымаў тую пераемнасць традыцый, якая існавала яшчэ з часоў Савецкага Саюза. Самае галоўнае, што захавалася інфраструктура — тыя ж санаторыі і дамы адпачынку.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# адзінства грамадства

Зараз у нашай сістэме працуюць 12 санаторна-курортных устаноў, 6 гасцініц, 6 турыстычных аб'ектаў у выглядзе турбаз, нават ёсць паляўнічая гаспадарка. Адначасова можа адпачываць 4,5 тысячы чалавек толькі ў санаторыях. Хацеў бы падкрэсліць, што мы пастаянна працуем над удасканаленнем сістэмы аздараўлення. Штогод выдзяляюцца значныя сродкі для мадэрнізацыі, капітальных рамонтаў аб'ектаў, набыцця неабходнага абсталявання. У першую чаргу прадастаўляюцца пуцёўкі для членаў прафсаюзаў, людзі маюць важкія зніжкі. Практыкуюцца новыя формы работы ў санаторыях, на турбазах, якія знаходзяцца ва ўнікальных найпрыгажэйшых мясцінах. Сярод іх — стварэнне палатачных гарадкоў. Сёлета на Браслаўскіх азёрах арганізавалі вялікі палатачны гарадок з трохразовым харчаваннем у нашых сталовых. Гэтая пляцоўка карысталася вялікім попытам. Так што ёсць шырокія магчымасці для адпачынку і аздараўлення, якімі людзі з задавальненнем карыстаюцца.

## «ПРАКТЫКААРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД»

***— Якім чынам адаптуецца прафесійная адукацыя да патрабаванняў рынку працы, якую ролю ў гэтым важным працэсе адыгрываюць прафсаюзы?***

— Сёння ўся сістэма адукацыі выбудавана праз адрасны запыт на той ці іншы кірунак, які неабходны нашай эканоміцы. Тут задзейнічаны ўсе ключавыя міністэрствы і ведамствы. Федэрацыя прафсаюзаў аналізуе рынак працы, мы ўдзельнічаем у падрыхтоўцы заявак. У тым ліку Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО» рыхтуе спецыялістаў па адпаведных кірунках.

Таксама надзвычай важна належнае развіццё сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Зразумела, што эфектыўнасць работы прадпрыемства ў многім залежыць менавіта ад яго кадравага патэнцыялу. Вытворцам неабходны спецыялісты з добрай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкай. Гэта насамрэч агульная задача і для навучальных устаноў, і для прадпрыемстваў — заказчыкаў кадраў. Менавіта практыкаарыентаваны падыход, прадастаўленне магчымасці студэнтам асвойваць прафесію непасрэдна на вытворчасці, дае магчымасць маладым людзям і навучацца, і ў той жа час бачыць перспектывы свайго прафесійнага росту. А прадпрыемствы ў сваю чаргу бачаць свае патэнцыйныя кадры.

Дарэчы, менавіта дзеля якаснай практычнай падрыхтоўкі будучых аграрыяў прафсаюзы нядаўна перадалі навучэнцам Лепельскага аграрна-тэхнічнага каледжа трактар BELARUS. Гэта сучасная мадэль тэхнікі, якая выкарыстоўваецца ў многіх арганізацыях. Такім чынам у навучэнцаў будзе дадатковая магчымасць загадзя пазнаёміцца з тэхнікай, каб прыйсці на работу ўжо падрыхтаванымі спецыялістамі.

## «МНОГІЯ РЭЧЫ ВЫРАШАЮЦЦА НА ЎЗАЕМАДАПАМОЗЕ»

***— Як прафсаюзы далучыліся да ўборачнай кампаніі?***

— Прафсаюзы заўжды актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі ўборачнай кампаніі, аказвалі неабходную дапамогу. Асноўная наша задача — каб своечасова выплачвалася заработная плата, былі бяспечныя ўмовы працы, каб людзі былі забяспечаны гарачым харчаваннем. Да пачатку ўборачнай кампаніі сельгаспрадпрыемствы падышлі з поўнай гатоўнасцю. І нейкіх сістэмных пытанняў сёння ў гэтай сферы няма. Часам здараюцца пазаштатныя сітуацыі — зламалася тэхніка ці яшчэ што. Але ўсё гэта хутка вырашаецца.

Дарэчы, на час уборачнай кампаніі мы запусцілі «гарачую лінію» па ўмовах працы ўдзельнікаў жніва. Працуе яна кожны дзень — з 8-30 да 22 гадзін. Зваротаў паступае не так шмат. Гэта яшчэ раз сведчыць, што ў пераважнай большасці да арганізацыі працы ўдзельнікаў уборачнай кампаніі наймальнікі падыходзяць адказна. Разам з тым было і некалькі выпадкаў, калі пасля звароту прадстаўнікі прафсаюза выехалі на месца, і скаргі людзей пацвердзіліся. Напрыклад, былі нараканні на тое, што не працуе кандыцыянер у трактары, што няправільна вядзецца ўлік працоўнага часу. Наймальнікі аператыўна адрэагавалі на заўвагі прафсаюза і папраўлі сітуацыю.

Гэты досвед нам паказвае, што вельмі важна ацэньваць рэальную сітуацыю на месцах вачыма саміх работнікаў. Таму зараз мы разглядаем магчымасць зрабіць у прафсаюзах пастаянную «гарачую лінію» па ўсіх пытаннях, звязанных з працоўнай сферай. Такі вопыт работы ёсць у Кітаі. Там працуюць у кругласутачным рэжыме «гарачыя лініі» з вельмі хуткай рэакцыяй на тое ці іншае пытанне. Ёсць сістэма кантролю за рэагаваннем на заявы работнікаў. Думаю, што мы такую ж сістэму выбудуем у Беларусі. Ёсць магчымасць перафарматаваць пэўныя кірункі работы і стварыць аператыўную міжгаліновую «гарачую лінію», якая збірае інфармацыю і накіроўвае на рэагаванне. Варта трымаць руку на пульсе. Перакананы, што гэтая работа будзе мець плён.

***— Удзельнічаюць прафсаюзы і ў ліквідацыі наступстваў непагадзі...***

— Прафсаюзы заўсёды настроены на тое, каб па максімуме падключыцца да важных спраў. Патрыётаў нашай краіны шмат, яны гатовыя дапамагчы. Не ўсё вымяраецца грашыма, многія рэчы вырашаюцца на патрыятычным, добрым, душэўным падыходзе. На салідарнасці і ўзаемадапамозе.

Так і з ліквідацыяй наступстваў стыхіі. Людзі выйшлі на суботнікі — маштабны працоўны дэсант па ўборцы тэрыторый, навядзенні парадку. Больш за 2 тысячы прафсаюзных актывістаў працавалі ў той жа Гомельскай вобласці. Дзе неабходна, дапамагалі і матэрыяльна: закупілі і перадалі бензапілы, бензагенератары. На месцах прафкамы дапамагалі работнікам сваіх прадпрыемстваў, тым, каму стыхія нанесла сур'ёзную шкоду дамам. У далейшым мы гатовы падключыцца і да аднаўлення лесу на тэрыторыях, дзе прайшоў ураган.

## «УМАЦОЎВАЦЬ МІЖНАРОДНУЮ САЛІДАРНАСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ»

***— Як развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва, у тым ліку з найбуйнейшай у свеце па колькасці членаў Усекітайскай федэрацыяй прафсаюзаў?***

— Скажу не толькі як старшыня Федэрацыі прафсаюзаў, а і як былы пасол Беларусі ў Кітаі — у пэўны час мы сутыкаліся і сутыкаемся з ціскам на нашу краіну на розных міжнародных пляцоўках. Але ў гэтай сітуацыі ёсць плюс — высветлілася, што ў Беларусі шмат партнёраў, якія поўнасцю падтрымліваюць нашу палітыку. Наша задача — праз міжнародныя пляцоўкі, з дапамогай сяброўскіх краін, спакойна распавесці сваю пазіцыю. У тым ліку тым, хто атрымаў не зусім дакладную інфармацыю. Прафсаюзы зараз наладзілі прамыя кантакты з многімі замежнымі калегамі. Адзін з моцных партнёраў — Кітай, з якім добразычлівыя, даверлівыя кантакты, шмат у чым дзякуючы сяброўскім адносінам паміж лідарамі нашых краін. Па лініі прафсаюзаў нам цікава працягнуць пераймаць досвед работы КНР, прафсаюзаў Кітая. Наймагутнейшая арганізацыя, адна з самых вялікіх у свеце. Нядаўна мы праводзілі сустрэчу з Пекінскай прафсаюзнай арганізацыяй, у якой каля 8 мільёнаў членаў. У бліжэйшай перспектыве — правесці сустрэчу з цэнтральным апаратам Усекітайскай федэрацыі прафсаюзаў для працягу работы, якая была выбудавана. Нам таксама ёсць чым падзяліцца.

Усё гэта датычыцца і Расіі, іншых сяброўскіх краін. І на міжнародных пляцоўках у нас поўная падтрымка. Наконт абароны правоў працоўных, адстойвання суверэнітэту. Усе прынцыпы і падыходы супадаюць.

Прэзідэнт дакладна вызначыў, што не трэба нам замежных каштоўнасцяў. Нашы традыцыі складваліся стагоддзямі, іх неабходна захаваць. Мы павінны жыць так, як самі беларусы жадаюць, а не па лякалах Захаду. Беларусы павінны прымаць рашэнні. Чалавек — аснова ўсяго.

Беларускія прафсаюзы — надзейная платформа адзінства грамадства. У гэтым наша моц і наша перспектыва. Прафсаюзы як самая масавая грамадская арганізацыя, як сказаў Прэзідэнт «народная партыя», аб'ядноўваюць усе патрыятычныя сілы. Мы выступаем ініцыятарамі многіх важных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў Беларусі. Спадзяюся, што так будзе і надалей. Прынамсі, для гэтага створаны ўсе перадумовы.

**Гутарыў Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



**Акцэнты**

### БАЧЫЦЬ СВОЙ КАДРАВЫ РЭЗЕРВ

Прафсаюзы ўдзяляюць асаблівую ўвагу пытанням сацыяльнай падтрымкі і абароны навучэнскай, студэнцкай і рабочай моладзі, выступаюць за пашырэнне сацыяльных гарантый для маладых спецыялістаў. Звыш 87 % ад усіх калектыўных дагавораў прадпрыемстваў і арганізацый уключаюць нормы па дадатковай падтрымцы моладзі. Гэта матэрыяльныя выплаты, дапамога ў вырашэнні жыллёвых пытанняў, магчымасць павышэння кваліфікацыі і перанавучання і многае іншае.

Не менш важным кірункам у рабоце прафсаюзаў з'яўляецца працяг традыцый інстытута настаўніцтва. Такая практыка ёсць на ўсіх прадпрыемствах і арганізацыях краіны. Калі з першага дня работы маладога чалавека навучаюць дасведчаныя калегі, уводзяць паэтапна ва ўсе тонкасці працоўнага працэсу, дзеляцца сваімі ведамі і навыкамі. Асаблівую ролю такая практыка адыгрывае на прамысловых прадпрыемствах, бо кожная вытворчасць мае сваю спецыфіку. І ў многіх выпадках агульнай падрыхтоўкі ва ўстанове адукацыі недастаткова. Таму з першага працоўнага дня за маладымі людзьмі замацоўваюцца вопытныя работнікі, якія дапамагаюць хутка адаптавацца да працоўнага працэсу.

Сёння многія прадпрыемствы рыхтуюць сабе кадры літаральна са школы. Практыка супрацоўніцтва навучальных устаноў і арганізацый, у прыватнасці падпісанне трохбаковых дагавораў на мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў, паказваюць сваю эфектыўнасць. Плюсоў ад такой практыкі больш чым дастаткова для кожнага з бакоў. Для школьнікаў бясспрэчнымі перавагамі з'яўляюцца асобны конкурс пры паступленні, перспектыва атрымання запатрабаванай прафесіі, праходжанне ў перыяд навучання практыкі на прадпрыемстве і, што немалаважна, гарантыя працаўладкавання. У сваю чаргу, прадпрыемствы бачаць свой кадравы рэзерв, на які могуць разлічваць у далейшым. За час практыкі яны навучаюць маладых людзей, улічваючы сваю спецыфіку вытворчасці, што ў далейшым не толькі закрывае кадравыя пытанні, але і дазваляе прымаць на працу добра падрыхтаваных спецыялістаў.

### ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА

Пытанні працаўладкавання, гарантыі і бонусы маладым спецыялістам напярэдадні прыбыцця іх на першыя працоўныя месцы знаходзяцца на кантролі ў Федэрацыі прафсаюзаў. Тэрміны прыбыцця на працоўнае месца, кампенсацыя за пераезд у іншую мясцовасць, вырашэнне жыллёвага пытання, афармленне працоўных адносін, даванне належных гарантый, у тым ліку так званых пад'ёмных — кожны з гэтых пунктаў мае шэраг сваіх асаблівасцяў. Напрыклад, пры афармленні працоўных адносін з маладым спецыялістам можа быць заключаны кантракт або бестэрміновы працоўны дагавор — гэта вызначаецца па пагадненні наймальніка і работніка. Пры гэтым у дагаворы не можа быць устаноўлены выпрабавальны тэрмін. Што датычыцца выплат, то тым, хто размеркаваны не па месцы жыхарства, даецца аднаразовая дапамога ў памеры месячнай тарыфнай стаўкі (акладу). Акрамя таго, на працягу месяца пасля афармлення працоўных адносін наймальнік павінен выплаціць і грашовую дапамогу ў памеры апошняй стыпендыі. Прадугледжаны і шэраг іншых дадатковых выплат у залежнасці ад галіны. Яшчэ адзін немалаважны момант: у перыяд работы па размеркаванні маладыя спецыялісты не могуць быць звольнены па неадпаведнасці займаемай пасадзе або недастатковай кваліфікацыі.

Як правіла, сёння вострых пытанняў, звязаных менавіта з працаўладкаваннем маладых спецыялістаў, не ўзнікае. Найчасцей ім патрабуецца кансультацыя. Напрыклад, у які тэрмін неабходна прыбыць на работу, якія дакументы пры сабе трэба мець, на якую працягласць водпуску можна разлічваць і іншыя. Пытанні ўзнікаюць, калі маладыя спецыялісты пачалі сваю працоўную дзейнасць. Гэта сітуацыі з магчымым пераразмеркаваннем, пераход да іншага наймальніка, скасаванне або падаўжэнне кантрактаў, магчымасць пераводу на іншую пасаду. Па ўсіх гэтых пытаннях прафсаюзы даюць падрабязныя кансультацыі.

### «МАБІЛЬНАЯ СТАЛОВАЯ» І МЕДАГЛЯДЫ ПАДЧАС ЖНІВА

Гарачыя абеды з дастаўкай работнікам палёў прама да месца працы даўно сталі нормай. У многіх сельгасарганізацый ёсць уласныя сталовыя, дзе рыхтуюць смачную і сытную хатнюю ежу. Для ўдзельнікаў жніва таксама абсталяваны месцы для прыёму ежы ў палявых умовах — закуплены сталы, лаўкі або крэслы. Падчас спякоты гэтая «мабільная сталовая» пераносіцца ў цень, а таксама ўстанаўліваюцца палаткі. На гэтыя пытанні пры наведванні арганізацый прафсаюзы звяртаюць увагу і пры неабходнасці падключаюцца і дадаткова набываюць неабходныя камплекты.

Вынікі прафсаюзнага маніторынгу сведчаць аб тым, што ў большасці сельгаспрадпрыемстваў арганізавана двухразовае гарачае харчаванне. У некаторых гаспадарках у залежнасці ад графіка работы прадугледжана і трохразовае харчаванне. Пры гэтым большасцю калектыўных дагавораў прадугледжваецца патанненне кошту харчавання для ўдзельнікаў палявых работ. Прафсаюзы сумесна з наймальнікамі працуюць над тым, каб зніжка дасягала ад 70 да 90 працэнтаў.

Ужо традыцыйна пры ФПБ падчас уборачнай кампаніі працуе Рэспубліканскі штаб. У яго рабоце задзейнічаны не толькі прадстаўнікі прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу, але і ўсіх галіновых прафсаюзаў. Пад увагай спецыялістаў усе надзённыя пытанні работнікаў сельскай гаспадаркі ў гарачую пару — ад укамплектавання камбайнаў аптэчкамі, вогнетушыцелямі, наяўнасці сродкаў індывідуальнай абароны, спецадзення да забяспечанасці пітной вадой. У гэтым годзе прафсаюз работнікаў АПК сумесна з галіновым прафсаюзам работнікаў аховы здароўя распачаў яшчэ адну важную практыку. Да працаўнікоў у палях падчас абеду прыязджаюць і медработнікі, каб своечасова ацаніць здароўе і стан чалавека.

**Руслан ЧАРНЕЦКІ:**

# «У МЯНЕ НАКАЗ АД ВЫБАРШЧЫКАЎ — НЕ СЫХОДЗІЦЬ СА СЦЭНЫ»

**Гэты вядомы акцёр тэатра і кіно заўсёды адрозніваўся яшчэ і актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якую ніколі не баяўся агучваць. Ён сцвярджае і ў сваіх выказваннях, і сваёй творчай і грамадскай дзейнасцю — галоўнае для чалавека не быць абыякавым да сваёй Радзімы, да гісторыі свайго народу. Сёння заслужаны артыст Беларусі Руслан ЧАРНЕЦКІ з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання, членам Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы. Што значаць для Руслана Іосіфавіча дэпутацкія абавязкі, як працуецца ў якасці дэпутата, як сумяшчаюцца грамадская дзейнасць і творчая, акцёр і дэпутат распавядае чытачам «Звязды».**



## «НЯСУ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЎСІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ КУЛЬТУРЫ»

***— У адной з гутарак на пытанне, чаму вы наважыліся стаць дэпутатам, вы адказалі, што хацелі дапамагаць людзям...***

—Так. Усё свядомае жыццё я шукаў сваю мэту, і нядаўна яна нарэшце сфармавалася. У маім разуменні жыццёвая мэта павінна быць дакладна і проста выказаная, не так, як у Дастаеўскага, вялізнымі абзацамі. І калі я сфармуляваў для сябе сваю мэту, з'явіліся адказы на пытанні, якія задаваў сабе цягам усёй сваёй кар'еры. Нічога выпадковага ў маім жыцці няма. Мяне нібыта нехта падштурхоўваў на паваротах жыцця ў той ці іншы бок, і ў выніку ўсё вырульвала туды, куды трэба. Зрэшты, маё жыццё настолькі цікавае, што тут складана не стаць фаталістам.

***— Рэдка даводзіцца чуць ад людзей шчырае «маё жыццё такое цікавае». Вы, значыць, шчаслівы чалавек...***

— Безумоўна, я шчаслівы чалавек.

***— Вы — вядомы артыст, вельмі запатрабаваны, на сцэне, на экране, на канцэртных пляцоўках усе бачаць, што вы робіце... Але не ўсе, мабыць, уяўляюць, з чаго складаецца ваша дзейнасць як дэпутата і наколькі яна складаная.***

— Дэпутацкая дзейнасць — абсалютна не фармальнасць. Мы працуем вельмі шчыльна і вельмі сур'ёзна. Нядаўна прайшла першая сесія дэпутатаў восьмага склікання Палаты прадстаўнікоў... Я ўвайшоў у склад Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы. За тры месяцы нашай сесіі, з пачатку красавіка па канец чэрвеня, прынялі трыццаць чатыры законапраекты. Прыкладна палова з іх — непасрэдна законы. Таксама адбылася ратыфікацыя вельмі важных пагадненняў. Не кажу ўжо пра прыняцце на Усенародным беларускім сходзе Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны нашай краіны. Гэта найважнейшыя стратэгічныя дакументы, па якіх мы будзем жыць вельмі доўгі час. А датычна дапамогі грамадзянам — дык да нас увесь час паступаюць звароты, як афіцыйныя, пісьмовыя, так і пры асабістых сустрэчах. Напрыклад, да мяне звяртаецца калега: «Руслан, я жыву ў тваёй акрузе, у мяне ўзнікла вось такая праблема, што з гэтым рабіць, патлумач, раскажы». Я звязваюся з мясцовымі ўладамі, мясцовыя ўлады адразу ж даюць мне канкрэтны адказ, я тлумачу таму, хто да мяне звярнуўся, алгарытм дзеянняў... І такіх зваротаў шмат. Я ж «дэпутат у палях», і я ж не толькі за сваю акругу, у якой балатаваўся, нясу адказнасць, але і за ўсіх прадстаўнікоў культуры. Таму што я непасрэдна ўнутры гэтай сферы. У кіно, у тэатры, на тэлебачанні, на эстрадзе, з пісьменнікамі супрацоўнічаю. Мабыць, я адзіны прадстаўнік культуры ў Палаце прадстаўнікоў, які мае сувязь адразу з усімі адгалінаваннямі культуры, што звычайна ідуць паралельна, а я іх увесь час перакрыжоўваю. Шмат каго ведаю, і мяне шмат хто ведае і сярод дзеячаў культуры, і сярод прадстаўнікоў выканаўчай улады. І дзякуючы гэтым абставінам у мяне ёсць вялікая магчымасць дапамагаць не толькі маім непасрэдным выбаршчыкам, але і ўсім прадстаўнікам культуры Беларусі.

***— А якая ваша акруга?***

— Дзевяноста дзявятая, Ясенінская. Гэта мінскі мікрараён Малінаўка.

***— Карацей, цяпер усе «малінаўскія» ведаюць, да каго звяртацца па дапамогу...***

— І звяртаюцца. Вельмі шмат прадстаўнікоў культуры, дарэчы, жыве ў маёй акрузе. І нават не ўяўляеце, колькі іх за гэты час паведаміў мне: «Руслан, ты мой дэпутат, я за цябе галасаваў».

***— А з якімі звычайна пытаннямі прыходзяць?***

— Ды з рознымі. І з побытавымі, і з тымі, што тычацца заканадаўства. Самы першы запыт, які да мяне паступіў, як толькі я выбраўся, ад прадстаўнікоў нашых сфер, — найважнейшае пытанне наконт працоўных адносін, звязаных з індывідуальным прадпрымальніцтвам і самазанятасцю. Статус самазанятых дасюль да канца не вызначаны. Вядома, калі з'яўляецца такая колькасць юрыдычных асоб у краіне — трохі дзіўна... Але я цалкам разумею, для чаго ўзнікла гэтая рэформа, я яе цалкам падтрымліваю. Проста трэба выпрацаваць механізм, каб людзям усё стала проста і зразумела, каб усе спакойна працавалі і плацілі падаткі, каб грошы не сыходзілі з краіны.

***— А як адбываецца работа ў Пастаяннай камісіі парламента, у склад якой вы ўваходзіце?***

— Паколькі гэта камісія па адукацыі, культуры і навуцы, яе склад вялікі, дзевяць чалавек. Большасць у камісіі менавіта прадстаўнікоў сферы адукацыі, людзей, якія прысвяцілі гэтаму ўсё сваё жыццё — і школе, і вышэйшым навучальным установам. Наша камісія ініцыіруе альбо папраўкі ў нейкі закон, альбо прыняцце нейкага закона. Дапусцім, пытанне пра нейкія недапрацоўкі ў Кодэксе аб адукацыі. Мы просім дэпутатаў парламента сабраць пэўную статыстычную інфармацыю па сваіх акругах. Яны робяць запыты ў мясцовыя органы выканаўчай улады, ім прыходзяць адказы, якія яны накіроўваюць да нас у камісію. Мы ўсё гэта разглядаем, абмяркоўваем, наколькі недахоп магчыма выправіць, наколькі змены патрэбныя ці не патрэбныя. Збіраем круглыя сталы і семінары. Рыхтуем пакет заканапраекта і накіроўваем у Міністэрства адукацыі. Там яго разглядаюць, нечым дапаўняюць. Калі ініцыятыва нейкіх паправак у законапраект ідзе з іх боку, дык яны накіроўваюць нам запыт. У заканадаўстве ўдзельнічаюць заўсёды тры зацікаўленыя бакі: адпаведнае ведамства, парламент і Савет міністраў. Калі законапраект гатовы, ён агучваецца ў першым чытанні ў парламенце. Там задаюцца пытанні, робяцца нейкія заўвагі. Законапраект прымаецца ці не прымаецца, адпраўляецца на дапрацоўку. Потым зноў абмяркоўваецца, дапаўняецца, накіроўваецца па розных юрыдычных інстанцыях, праходзіць камісіі. Вяртаецца да нас і прымаецца ці не прымаецца ў другім чытанні. Як толькі ён прымаецца і яго падпісвае Прэзідэнт, праз пэўны час ён уступае ў сілу.

## «КАЛЕГІ З ПАРЛАМЕНТА ЗРАБІЛІСЯ ЧАСТЫМІ ГАСЦЯМІ Ў НАШЫМ ТЭАТРЫ»

***— Вы гаворыце як прафесійны палітык. Магчыма, у вас яшчэ ёсць нейкая адукацыя, акрамя тэатральнай?***

— Не. Але на той момант, як пачалася электаральная кампанія, я быў дастаткова падрыхтаваны чалавек. Паліталогія, глабальная эканоміка — гэта мае хобі ўжо колькі гадоў. Мяне заўсёды цікавіла, што адбываецца ў свеце, да чаго яно ідзе. Асабліва калі ў тваёй сям'і з'яўляецца маленькі чалавек, дзіця, і цябе непакоіць, якая яго чакае будучыня і ў якой краіне ён будзе жыць. Калі нарадзілася дачка, я пачаў глыбока пагружацца ў гэтую тэму. І да пачатку перадвыбарчай кампаніі ўжо многа ведаў і разумеў, і рабіў свае высновы. Кожны дзень праз мяне праходзяць тэрабайты інфармацыі — навіны, меркаванні экспертаў, эканамістаў, палітолагаў. І не толькі датычна нашай краіны — мне цікава, што будзе са светам у цэлым, тады лягчэй рабіць высновы, што будзе з нашай краінай. І яшчэ — як толькі мы пачалі работу ў парламенце, у нас увесь час праходзяць семінары па заканатворчасці, так што навучанне ідзе.

***— І такую напружаную грамадскую дзейнасць вы сумяшчаеце з творчай працай, якой у вас вельмі і вельмі шмат...***

— У мяне наказ ад выбаршчыкаў — не сыходзіць са сцэны. Законам мне дазволена па ўзгадненні са старшынёй Палаты прадстаўнікоў займацца на прафесійнай аснове творчай дзейнасцю.

***— Калегі-дэпутаты прыходзяць на вашы спектаклі ў Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага?***

— Так, вядома. З задавальненнем іх запрашаю. І рады, што яны праяўляюць ініцыятыву ў гэтым плане. І дэпутаты з рэгіёнаў нярэдка просяць — вось, жонка прыязджае на выхадныя, хацелі б у тэатр схадзіць. Што ў вас можна паглядзець? Так што мае калегі з парламента зрабіліся частымі гасцямі ў нашым тэатры, што мяне вельмі цешыць.

***— У тэатры загрузка ў вас вялікая... Вы і ў кіно звычайна шмат загружаны...***

— Сёння такой загрузкі ў кіно няма. Усёткі дэпутацкая мая дзейнасць час забірае, тым больш мы толькі пачалі працу, для многіх усё новае, трэба звыкнуцца з графікамі. А так здымацца мне ніхто не забараняе, і я буду гэта рабіць. Зараз агучваю дыктарскі тэкст у дакументальным фільме пра Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, што здымаецца на студыі «Летапіс». На такі праект я час знайшоў бы абавязкова, таму што гэта вельмі важная тэма цяпер. На такія важныя духоўныя тэмы існуе вельмі сур'ёзны запыт не толькі ад прафесіяналаў, але і ад простых гледачоў. Ім ужо надакучылі прымітыўныя камедыі, насмяяўся без прычыны, надакучылі спецэфекты, пошласць, гвалт на экране і на сцэне. У фільмах павінен быць ідэалагічны пасыл, маральны кірунак. Таму што за апошнія гадоў сорак у відовішчным мастацтве вельмі ўсё ў гэтым сэнсе дэградавала. А гледачу сёння хочацца глядзець на сапраўдных герояў, людзей, якія нечым ахвяруюць дзеля вышэйшых мэтаў. І мы гэты запыт адчуваем.

## НЕ ПА ЗАДАННІ, ПА ПОКЛІЧЫ СЭРЦА

***— Што ж, будзем спадзявацца, што праекты на сур'ёзныя тэмы будуць з'яўляцца часцей. З'яўляюцца і цяпер — спектакль «Горкі хлеб» Тэатра імя М. Горкага пра лёсы дзяцей у час вайны, у якім вы іграеце...***

— Не па заданні, па покліччы сэрца хацелася зрабіць такі спектакль да 80-годдзя вызвалення Беларусі. Тая тэма, якую мы ў гэтым спектаклі паднімаем — пра яе мала хто гаварыў у мастацкіх творах, мабыць толькі Мікалай Іванавіч Чаргінец у сваім знакамітым рамане «Аперацыя «Кроў». Але там узятая толькі адна трагічная гісторыя, пра дзяцей, з якіх фашысты выкачвалі кроў для сваіх параненых. А тое, што перажывалі ўсе дзеці, якія жылі ў час вайны — гэта ж вялізная трагедыя ў бясконцай колькасці сюжэтаў... Для мяне яна не з'яўляецца нечым невядомым. Мне пра гэта распавядала маці, таму што сама гэта перажыла. Яна 1939 года нараджэння. Памятае, як спалілі іх вёску, як блукалі яны з дома ў дом, як іх перавезлі ў Сафонава на Смаленшчыне, як яны там на палях бульбу гнілую падбіралі, бо есці не было чаго. Як біліся з-за агрызка. Як абутку зімовага не мелі і хадзілі па снезе ў летнім. Усё гэта мая мама памятала і распавядала мне. А многія з нашых гледачоў, як выявілася, і ўявіць сабе не маглі. Мы ведаем пра нашых герояў. Іх подзвіг у час вайны, безумоўна, бясцэнны. Пра іх знята, спета, напісана вельмі шмат. А пра звычайных дзяцей у час вайны не гаворым. Адна з гісторый нашага спектакля — пра дзвюх дзяўчынак, якія паехалі ў дзіцячы санаторый. Бацькі засталіся ў Крупскім раёне, а дзяўчаткі апынуліся ў Астраўцы. Адной сем, другой дзевяць. Пачалася вайна. Вакол немцы. Невядома, што рабіць. Як тыя дзяўчаткі шукалі бацькоў... Магу ўявіць, што рабілася з бацькамі... Гэта страшна. Я бачу, што спектакль мае водгук і вельмі сур'ёзны, у сэрцах гледача, і, спадзяюся, будзе мець. Таму што калі і такое не паўплывае на кагось, не перакапае, што вайна — зло, што мір трэба захоўваць, дык не ведаю, што...

***— Сям'я з разуменнем паставілася да таго, што тата-дэпутат цяпер будзе мець яшчэ менш вольнага часу?***

— Зразумела. Я шчаслівы чалавек у першую чаргу таму, што ў мяне цудоўная сям'я і самая лепшая ў свеце работа. Мая сям'я заўсёды мяне падтрымлівае. Дзяўчаты мае, і жонка, і дачка, заўсёды падстаўляць пляцо.

**Гутарыла Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Тэатр

# АД «ПАЎЛІНКІ» ДА... «ПАЎЛІНКІ»

**Завяршыўся 104-ы сезон у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. За гэты час там здолелі рэалізаваць шмат творчых планаў, паставілі некалькі прэм'ерных спектакляў і наладзілі міжнародныя культурныя сувязі.**

Як адзначыў генеральны **дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Аляксандр ШАСТАКОЎ**, бягучы сезон запомніцца многімі падзеямі: «Гэты быў сапраўды насычаны на падзеі сезон, і я хачу падзякаваць усім супрацоўнікам Купалаўскага тэатра за іх самаадданасць, вернасць сваёй справе і натхненне для вырашэння нашых агульных задач». 26 ліпеня, у дзень закрыцця сезона купалаўцы па традыцыі паказалі сваю неўміручую «Паўлінку», яна ж сустрэне гледачоў 29 жніўня ў пачатку новага, юбілейнага, сезона.

У сто пятым Аляксандр Шастакоў паабяцаў маштабнае абнаўленне і, вядома, выпуск новых спектакляў. За ўвесь 104-ы сезон Купалаўскі тэатр прадставіў гледачу тры новыя спектаклі. Так, напрыканцы мінулага года, 2 снежня, на камернай сцэне прайшла прэм'ера пастаноўкі «Двор майго дзяцінства» ад рэжысёра-пастаноўшчыка Даніїла Філіповіча, якая была прысвечана гораду Мінску. Яна заклікае людзей да захавання нацыянальных традыцый і ўзбагачэння культуры тэатра. А 28 снежня на сцэне прадставілі новы спектакль, па ўжо даўно ўсім вядомым творы пра вайну Барыса Васільева «А зоры тут ціхія», ад расійскага рэжысёра Дзмітрыя Акімава. Трэцюю прэм'еру прэзентавалі ўжо 20 сакавіка 2024 года. Гледачы ўбачылі новую апрацоўку спектакля «Пісаравы імяніны», зробленую рэжысёрам Паўлам Марынічам на аснове аднайменнай п'есы Уладзіслава Галубка. У ёй вельмі яскрава адлюстроўваюцца ўсе рысы беларускага характару і менталітэту.

Акрамя гэтага 104 сэзон у тэатры Янкі Купалы запомніцца і шэрагам асаблівых падзей. Да прыкладу, 22 снежня 2023-га ў Каміннай зале была падпісана дамова аб супрацоўніцтве з Нацыянальным драматычным тэатрам Расіі (Александрынскім тэатрам). Значным для Купалаўскага тэатра таксама стаў удзел у VII Рэспубліканскім конкурсе тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» (з 25 кастрычніка да 18 лістапада 2023 года) у якасці дырэкцыі. Падчас конкурсу народная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Міронава атрымала ўзнагароду як лаўрэат прэміі журы. З 13 да 23 мая Купалаўскі тэатр меў гонар стаць адным з арганізатараў ІІ Рэспубліканскага тэатральнага фестывалю «Перамога».

Таксама адсвяткавалі шмат знакавых дат. З юбілеем тут віншавалі Зінаіду Зубкову, Андрэя Зыля, Ірыну Ламака, Уладзіміра Рагаўцова. А вядомы спектакль «Паўлінка» справіў сваё 80-годдзе. Цяпер купалаўцы рыхтуюцца радаваць сваю публіку новымі спектаклямі ў новым, юбілейным 105-м сезоне.

**Маргарыта ЖЫГАР.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

8 ЖНІЎНЯ
2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15982)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

# «АДЧУВАЮ, ШТО ПАТРЭБНАЯ ТУТ»



Маргарыта Кухта-Маслоўская пяць гадоў працуе галоўным рэдактарам у "Ляхавіцкім весніку". Самую высокую пасаду ў рэдакцыі газеты яна заняла ў дваццаць чатыры гады і са сваімі абавязкамі спраўляецца: напрыклад, колькасць падпісчыкаў у сацыяльных сетках у выдання расце, прагляды некаторых публікацый у месенджарах ужо перасягнулі за мільён, але на гэтым у рэдакцыі спыняцца не збіраюцца. Карэспандэнт «ЧЗ. Чырвонай змены» пагутарыла з гераіняй пра яе вучобу на факультэце журналістыкі БДУ, імклівы кар'ерны рост, спакусу працаваць у сталіцы і многае іншае.

***— Маргарыта, з чаго пачаўся ваш шлях у журналістыку?***

— Я супрацоўнічала з рэдакцыяй школьнай газеты для дзяцей і моладзі «Дзянніца» гімназіі горада Ляхавічы, у якой на той час вучылася. У нас быў распрацаваны праект сумесна з раённай газетай «Ляхавіцкі веснік», які называўся «Газета ў газеце», там я спрабавала сябе ў якасці карэспандэнта. Праца мне вельмі спадабалася — так апынулася ў гэтай сферы. Калі надышоў час выбіраць прафесію, то тагачасны галоўны рэдактар «Ляхавіцкага весніка» Вольга Барадзіна прапанавала паступаць на факультэт журналістыкі ў БДУ па мэтавым накіраванні, а потым вярнуцца і працягваць працаваць у родных мясцінах. Я пагадзілася, і недарма, бо ўсё склалася для мяне найлепшым чынам.

***— Чым запомнілася вучоба на журфаку?***

— Студэнцтва — найлепшыя гады ў маім жыцці. Я вучылася ў таго пакалення журналістаў-практыкаў, якое ўласна і стварала айчынную журналістыку. Ніколі не забуду Аляксандра Канстанцінавіча Свораба, які ўлюбіў мяне ў прафесію, вучыў, дапамагаў, кіраваў курсавымі работамі. Незлічонае мноства жыццёвых парад ён мне даў. Вельмі ўдзячна яму і ўсім яго калегам.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*Час маладых*

## Свята з карысцю

Дзень беларускіх студэнцкіх атрадаў урачыста адзначылі па ўсёй краіне 1 жніўня. Гэтай даты няма ў спісе афіцыйных дзяржаўных свят, аднак яна мае сваю гісторыю і сыходзіць каранямі ў далёкія 60-я, калі працоўны семестр працягваўся 62 дні, і менавіта на першы дзень жніўня прыпадала яго «медыяна».

Мерапрыемстваў у БСА сёлета было шмат. Байцы студэнцкіх атрадаў узялі ўдзел у рэспубліканскай маладзёжнай працоўнай акцыі «Дзень ударнай працы», якая была прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Усе заробленыя ад яе сродкі будуць накіраваны на будаўніцтва патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці. Яшчэ былі арганізаваны выставы, радыёэфіры, анлайн-марафоны і інтэлектуальныя гульні. А цэнтральнай падзеяй стала сустрэча пакаленняў «Гэта наша з табой біяграфія», падчас якой байцы змаглі задаць пытанні ветэранам студатрадаўскага руху і абмеркаваць з імі сучасныя дасягненні.

— Сёлета моладзі было дадзена амаль дзве тысячы аб'ектаў на больш чым 47 тысяч працоўных месцаў. З году ў год гэтая лічба прырастае, — адзначыў на сустрэчы **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**. — Сёння студэнцкі рух — фармат інтэграцыі ў рэальны сектар эканомікі, а таксама ўнікальная магчымасць паглядзець, што сабой уяўляе будаўніцтва буйных аб'ектаў інфраструктуры.

Таксама ён падзяліўся, што знакамітая будоўля патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці стала вялікім добраахвотніцкім парывам, аб'яднаўшым больш чым 2600 валанцёраў, у тым ліку і з першага зводнага беларуска-расійскага студэнцкага атрада:

— Байцы разумеюць, што некалі Брэсцкая крэпасць аб'яднала шматнацыянальны народ і сёння маладыя людзі таксама аб'ядналіся там вакол важнай патрыятычнай мэты: аднаўлення гэтага гістарычнага фундамента.

З кожным годам спіс цікавых праектаў толькі расце. Так, на базе ТРК «Гродна» і газеты «Гродзенская праўда» плануюць працаўладкаваць першых маладых людзей у рамках сэрвісных атрадаў, якія будуць аказваць садзейнічанне СМІ ў фарміраванні кантэнту.



## Гульня ў сучасным мастацтве

Нестандартная выстава «GameEmotion», напоўненая інтэрактывамі і віртуальнай рэальнасцю, адкрылася ў Палацы мастацтва ў Мінску.



— Тэму гульні мы выбралі невыпадкова, бо гэта тое, што суправаджае ўсіх нас з дзяцінства. Тая прастора, у якую вы тут трапляеце — гэта прастора ўзаемадзеяння, створаная з дапамогай мастацкіх сродкаў, — адзначыла на адкрыцці **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Самае цікавае, што тут прадстаўлены работы мастакоў розных пакаленняў. Многія працы вы можаце не проста памацаць рукамі, вы можаце ў іх пагуляць. Напрыклад, сабраць свае пазлы альбо стварыць уласны твор мастацтва.

Усяго ў экспазіцыі прадстаўлены работы 75 сучасных беларускіх мастакоў. Уся выстава дзеліцца на тры часткі: «Game-апусканне», «Game-інтэрактыў» і «Game-лічбавая прастора». Напрыклад, у «Game-апусканні» наведвальнікі могуць азнаёміцца з традыцыйнымі відамі мастацтва, а ў «Game-інтэрактыве» ёсць магчымасць выйсці за межы ролі гледача і стаць самым сапраўдным удзельнікам працэсу яго стварэння. Так, пасярод экспазіцыі ляжаць вялізныя гульнявыя косці, якія асабліва спадабаліся юным наведвальнікам. Апошняя секцыя ў сваю чаргу прысвечана лічбаваму жывапісу: 3D-графіцы, NFT, работам з дапоўненай рэальнасці і гэтак далей.

Атрымалася вельмі цікава, яскрава і дынамічна. Наведаць выставу ўсе жадаючыя могуць да 25 жніўня.

# «АДЧУВАЮ, ШТО ПАТРЭБНАЯ ТУТ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Пасля вучобы вы вярнуліся дадому, сталі працаваць у «Ляхавіцкім весніку»...***

— Адразу пасля заканчэння вучобы прыехала працаваць карэспандэнтам у родную газету. Тут чакалі і з цеплынёю сустрэлі выпускніцу журфака. Праз некаторы час быў заснаваны аддзел маладзёжнай тэматыкі, я стала яго загадчыкам. Пасля кіраўніцтва раёна прапанавала мне, маладому спецыялісту, узначаліць «Ляхавіцкі веснік». Вельмі ўдзячна, што заўважылі мяне сярод шэрагу не менш таленавітых і перспектыўных кандыдатаў. Галоўная матывацыя цяпер — апраўдаць давер раённай і абласной улады, Міністэрства інфармацыі. Страшна было спачатку, бо аказалася самым маладым галоўным рэдактарам у краіне.

***— Як гэтае рашэнне ўспрыняў калектыў?***

— Цалкам падтрымалі. І мяне, і ўвядзеныя пасля ўступлення ў пасаду навацыі: сёе-тое прыйшлося змяніць кардынальна. Калегі давяраліся, і, спадзяюся, я іх не падвяла. Безумоўна, калі прыходзіць новы кіраўнік — гэта заўсёды складана, бо нейкія звыклыя рэчы змяняюцца навоўвядзеннямі, якіх патрабуе час. Мне было прасцей — я вырасла ў «Ляхавіцкім весніку». Мае калегі — мае настаўнікі. У іх я навучылася многаму з таго, што сёння перадаю маладым людзям, якія прыходзяць да нас на практыку. Скажу больш, толькі дзякуючы калектыву «Ляхавіцкага весніка», я паверыла ў свае сілы. Стаўшы галоўным рэдактарам, спачатку не разбіралася ў многіх пытаннях, бо гэтая пасада не толькі пра творчасць, але і кіраўнічую дзейнасць. І сумесна з калегамі, якія дапамагалі ва ўсім, наладжана паспяховая работа.

***— Ці не было ў вас спакусы прыехаць працаваць у сталіцу пасля размеркавання?***

— Я не вельмі люблю буйныя гарады, мне па душы тое месца, дзе жыву і працую цяпер. Нават не ведаю, ці змагла б рэалізаваць сябе і свае ініцыятывы ў вялікім горадзе. У Ляхавіцкім раёне ведаю ўсё: людзей, прадпрыемствы, на якіх яны працуюць, праблемы, якія час ад часу ўзнікаюць. Гэта дапамагае ў прафесіі. Я адчуваю, што патрэбная тут.

***— Як вам удаецца ўтрымліваць аўдыторыю ў час, калі ідзе масавае перанасычэнне інфармацыяй?***

— У нашай рэдакцыі працуюць універсальныя спецыялісты, гатовыя аператыўна і тэксты на розныя тэмы пісаць, і відэа манціраваць, і фота апрацоўваць. Калі сталі папулярнымі сацыяльныя сеткі, мы вучыліся ствараць для іх кантэнт усёй камандай, каб на выпадак розных няштатных сітуацый калегі маглі падмяніць адно аднаго.

У нас кожная сацыяльная сетка замацавана за пэўным спецыялістам, у якога свой непаўторны стыль і падыход, таму на выхадзе атрымліваем унікальны кантэнт. Старонкі Telegram, Instagram і сайт газеты, напрыклад, маюць пэўныя адрозненні ў напаўненні, таму што ў кожнай сацыяльнай сеткі свая аўдыторыя: людзі розных узроставых груп, інтарэсаў, поглядаў. Мы адсочваем, чым яны цікавяцца, і публікуем адпаведны кантэнт. Ключ да поспеху ў тым, што мы ўсе працуем на вынік, і гэта адчувае наша аўдыторыя. Чытачы чакаюць навіны менавіта ад нас. Звычайна адбываецца так: мерапрыемства пачалося, а ў нашых сацсетках ужо ёсць публікацыя. Калі сутыкаемся з нейкімі непрадбачанымі складанасцямі — людзі пішуць, пытаюцца, што здарылася. Аўдыторыя прывыкла да таго, што мы працуем аператыўна.

***— Ці складана сумяшчаць кіраўнічую дзейнасць і творчасць?***

— Заняўшы пасаду галоўнага рэдактара, я баялася, што не змагу пісаць з-за недахопу часу, узровень майстэрства пагоршыцца. Каб гэтага не дапусціць, паабяцала сабе, што раз у нумар будзе выходзіць як мінімум адзін матэрыял майго аўтарства. Працую над гэтым.

Мая любімая тэматыка — уборачная кампанія, першыя тысячнікі, перадавыя экіпажы, сямейныя дынастыі — людзі працы. Выязджаю ў палі сама і фатаграфую, і здымаю відэа. Людзі, якія працуюць на палях, для мяне героі. І пра іх я пішу з вялікім натхненнем. Увогуле з задавальненнем бяруся за любую тэму — гэта своеасаблівы выклік сабе.

***— На вашу думку, ці можна журналіста навучыць пісаць?***

— Складанае пытанне. Добра памятаю, як рэдагаваліся мае першыя спробы пяра, за якія цяпер трохі сорамна. Тады я захаплялася талентам калег, іх уменнем падабраць патрэбныя словы для апісання любой з'явы, сітуацыі ці праблемы. Да ўзроўню таленавітага журналіста яшчэ расці і расці. Хутчэй, у мяне ёсць імкненне працаваць, таму заўсёды пісала і зараз працягваю гэта рабіць. Развіваць майстэрства можна і трэба. І калі напісаная табой словы кранаюць чытача да глыбіні душы — вось гэта дасягненне.

***— Сапраўдны журналіст, па-вашаму, які?***

— У яго ёсць жаданне шукаць інфармацыю і правяраць факты, рухацца наперад, даведвацца аб новым і распавядаць пра гэта іншым, прапускаючы праз сябе. Зацікаўленасць, калі не самая галоўная, то адна з важных якасцяў для журналіста. Карэспандэнт пастаянна павінен быць у пошуку. Я лічу тых людзей у нашай прафесіі паспяховымі, якія не сядзяць на месцы, не баяцца перашкод, гатовы несчаму навучацца.

***— Да вас у рэдакцыю сёлета на практыку прыйшлі журналісты-пачаткоўцы. Як можаце ахарактарызаваць заўтрашніх выпускнікоў?***

— Яны вельмі смелыя. Нядаўна нашы практыканты атрымалі заданне зняць ролік для «Цік-Тока» і зрабіць апытанне. Я ўбачыла вынік і зразумела, што яны глядзяць на ўсё пад унікальным ракурсам. Мы вучым іх, яны — нас. Гэта вельмі карысны ўзаемаабмен. Хацелася б, каб яны вярталіся ў раёны працаваць. Мы іх чакаем.

***— Раскажыце, калі ласка, падрабязней пра праект «Школьны дзённік».***

— Да нас у рэдакцыю стала пастпаць шмат школьных навін. Інфаповады былі класныя, а рэалізацыя недасканалай. Хацелася зрабіць кантэнт больш якасным. Для гэтага мы выбралі такі шлях: не самім перапісваць, а вучыць гэтаму юнкараў, запрашаць іх у рэдакцыю на майстар-класы. Для ўзгаднення такіх мерапрыемстваў мы звярнуліся ў аддзел па адукацыі, які падтрымалі нашы ініцыятывы. Прапанаваўшы школьнікам супрацоўніцтва, мы не маглі прадбачыць, што адгукнецца так многа падлеткаў. Зараз вучым іх так пісаць, фатаграфаваць і здымаць відэа, каб наша рэдакцыя потым магла зрабіць рэпост гэтых публікацый. Так стварылі сабе пэўную апору. Мы ганарымся нашымі юнкарамі. «Школьны дзённік» — ужо адладжаны механізм.

***— Ці не стамляецеся самі ад інфармацыйнага шуму?***

— Люблю адчуванне прыемнай стомленасці. Да таго ж людзі чакаюць, я не магу іх падвесці. Мой адпачынак — гэта час, праведзены з сям'ёй, у якой нарадзілася і якую стварыла. Я баюся ўявіць, што журналістыка сыдзе з майго жыцця. Яна дала мне ўсё.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

**Фота з асабістага архіва гераіні.**

*Пакаленне XXI*

# У МЕДЫЯСФЕРЫ ДАРОГІ АДКРЫТЫЯ ДЛЯ ЎСІХ

Днямі ў Доме прэсы правялі круглы стол «Моладзь і медыя: перспектывы маладых журналістаў у сучаснай медыяпрасторы», падчас якога далі старт прыёму заявак на Рэспубліканскі конкурс маладых журналістаў «Прэс-код». Адной з тэм абмеркавання сталі вынікі конкурсу папярэдніх гадоў, а яшчэ закранулі пытанні развіцця прафесійнага журналісцкага асяроддзя, станаўлення моладзі і ўкаранення яе ініцыятыў, удасканалення адкрытай і адказнай журналістыкі, магчымасці для ўзаемадзеяння і абмену вопытам. У круглым стале ўзялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў інфармацыі, адукацыі, СМІ, БРСМ, ВНУ і моладзі.

У сучаснай медыяпрасторы з імклівым развіццём лічбавых тэхналогій і сацыяльных сетак у маладых людзей ёсць шмат магчымасцяў для самарэалізацыі і паспяховага кар'ернага росту ў журналістыцы. Гэта адбываецца, таму што менавіта юнакі і дзяўчаты, як ніхто іншы, адчуваюць новыя тэндэнцыі, не баяцца выкарыстоўваць новыя фарматы і падыходы для творчай і прафесійнай рэалізацыі сябе ў гэтай сферы.

Рэспубліканскі конкурс «Прэс-код» быў створаны Міністэрствам інфармацыі і грамадскім аб'яднаннем БРСМ у 2021 годзе. Гэты праект рэалізуецца з мэтай выканання задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і вельмі актуальны і запатрабаваны моладдзю кожны год.

— Работа з моладдзю — найважнейшы складнік дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, — адзначыў **першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Наша міністэрства нацэлена на стварэнне ўмоў для хутчэйшага станаўлення маладых журналістаў і фарміраванне пэўнага кадравага рэзерву. Такія мерапрыемствы, як рэспубліканскі конкурс маладых журналістаў «Прэс-код», дапамагаюць вырашаць гэтыя задачы. Мы бачым, што конкурс спадабаўся маладым людзям. Пры гэтым удзельнікамі становяцца не толькі журналісты-пачаткоўцы, але і моладзь з самых розных сфер, якой цікава ствараць свой кантэнт. Мяркуючы па вялікай колькасці заявак на папярэдніх конкурсах, мы разумеем, што дасягнулі сваёй мэты. Прыемна, што пераможцы і прызёры ўжо сёння «на



алоўку» ў кіраўнікоў рэспубліканскіх СМІ. Многія з іх прыняты туды на работу, а некаторыя робяць дастаткова паспяховую кар'еру на ўзроўні рэгіянальных СМІ. Важна адзначыць, што конкурс «Прэс-код» акумулюе журналісцкія работы не толькі ў тэкставым варыянце, але і шукае таленавітую моладзь, якая валодае здольнасцямі ў фотажурналістыцы, мастацтве, аператарскай рабоце.

— Дзякуючы конкурсу мы можам знаходзіць маладых людзей, якія чамусьці адразу не ўбачылі сябе ў журналістыцы, але ў нейкі момант усвядомілі, што гэта іх прызванне, — адзначыў **першы намеснік ЦК ГА «БРСМ» Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.** — Конкурс дапамагае збіраць аўтарскія матэрыялы, карыкатуры, відэасюжэты, відэаблогі і яркія праекты з усёй краіны.

Адзін з такіх маладых людзей **Андрэй ШАМЫЧКОЎ, пераможца Рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» 2023 года ў намінацыі «Найлепшы відэаблог»,** падзяліўся сваім вопытам удзелу ў конкурсе і распавёў, чаму зацікаўленым маладым людзям неабходна спрабаваць свае магчымасці ў сферы «медыя»:

— Гісторыя на самай справе атрымалася пацешная: я вучыўся на энергетыка, працаваў у галіне маркетынгу, пры тым удзельнічаў у гэтым журналісцкім конкурсе, таму што мне было цікава паспрабаваць свае сілы, ацаніць, наколькі ў мяне вялікі багаж ведаў, і паглядзець, што з гэтага атрымаецца. Вынік — нечаканая перамога ў конкурсе. У медыясферы дарогі адкрыты для ўсіх, галоўнае — не ўпускаць магчымасці.

Пасля ўдзелу ў конкурсе Андрэй разам з БРСМ, НАН Беларусі і радыёстанцыяй «Пілот FM» стварылі сумесны праект «Хронікі вызвалення», у якім распавядалі аб ходзе ваеннай аперацыі «Баграціён», выкарыстоўваючы рассакрэчаныя аператыўныя зводкі Генеральнага штаба Чырвонай Арміі. «Я стаў вядучым і рэдактарам гэтага праекта, чаму быў вельмі рады. Ён займае асобнае месца ў маім сэрцы. Гісторыю сваёй краіны павінен ведаць кожны», — дзеліцца юнак.

Падчас круглага стала гаварылі і пра класічную журналісцкую адукацыю. Яна, па словах Андрэя Кунцэвіча, запатрабавана сярод маладых людзей. «Ва ўсякім выпадку, па тым конкурсе, які сёння склаўся на факультэце журналістыкі БДУ, можна меркаваць, што цікавасць да рэпарцёрскай прафесіі захоўваецца».

Сваё меркаванне выказаў і **дэкан факультэта журналістыкі БДУ Аляксей БЯЛЯЕЎ:**

— Прафесійная адукацыя важная і патрэбная. За апошнія год мы правялі рэфарміраванне навучальных праграм: пакінулі дзве спецыяльнасці «Журналістыка» і «Інфармацыя і камунікацыя». Плануем даваць шырокую адукацыю, рыхтаваць будучых супрацоўнікаў СМІ да работы ва ўсіх медыя. Кожны ў рэдакцыі павінен быць універсальным. Але мы выхоўваем не проста вытворцу кантэнту, але і грамадзяніна, патрыёта.

Удзельнікі мерапрыемства таксама звярнулі ўвагу на канструктыўнае і дэструктыўнае ўздзеянне сусветнай павуціны на моладзь. «Каб захаваць пераемнасць пакаленняў, трэба максімальна задзейнічаць інфармацыйны рэсурс, накіраваны на кансалідацыю грамадства, захаванне гісторыі і духоўна-маральнае выхаванне маладога пакалення, — адзначыў Андрэй Кунцэвіч. — У гэтым кірунку рэдакцыямі дзяржаўных СМІ ствараюцца і развіваюцца розныя цікавыя для моладзі праграмы і інфармацыйныя праекты, галоўная мэта якіх — працаваць на стварэнне, генерыраваць інфармацыйныя патокі канструктыўнага характару».

**Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.**

*Вітражы майстэрства*

# НА ШЛЯХУ ДА ПРАФЕСІІ ЧЫГУНАЧНІКА



У Мінску, непадалёку ад парку Чалюскінцаў, размясцілася незвычайная чыгуначная станцыя «Заслонава». Выглядае яна казачна, нібыта нехта разліў бутэлечку з «Алісы ў краіне цудаў» — і класічная станцыя зменшылася ў памерах, а замест вялікіх і важных дарослых усім пачалі запраўляць дзеці. Аднак ніякага чараўніцтва тут няма. Перад намі самая сапраўдная Дзіцячая чыгунка імя К. С. Заслонава, якая ў наступным годзе будзе адзначаць свой 70-гадовы юбілей.






— Дзіцячая чыгунка — гэта першая прыступка карпаратыўнай сістэмы адукацыі на Беларускай чыгунцы. Тут усё па-даросламу. Адрозненне толькі ў канструкцыі вагонаў і ў памеры каляіны. А ў астатнім наша работа выбудоўваецца гэтак жа, як і ў дарослых, — дзеліцца **начальнік Дзіцячай чыгункі імя К. С. Заслонава Максім МАРКАЎ.**

Уступіць у рады юных чыгуначнікаў можна з 5 да 7 класа. Праграма навучання разлічана на тры гады. Выхаванцы назапашваюць тэарэтычныя веды па самых розных прадметах ад агульнага курсу чыгункі да гісторыі чыгуначнага транспарту. На другім і трэцім годзе навучання ўжо паглыбляюцца ў тэорыю розных прафесій, здаюць залікі, экзамены і атрымліваюць допускі да летняй практыкі.



Тут і пачынаецца самае цікавае. Традыцыйна ў маі адкрываецца сезон летніх перавозак, дзе юныя чыгуначнікі могуць паспрабаваць сябе ў розных спецыяльнасцях: ад дыспетчара і праваднікa да начальніка станцыі і машыніста лакаматыва.

— Сама практыка непарыўна звязана з тым, што мы аказваем паслугі насельніцтву. Так, за мінулы сезон перавезлі каля 59 тысяч пасажыраў, у тым ліку і з замежных дзяржаў, — распавядае Максім Аляксандравіч.



На дадзены момант на Дзіцячай чыгунцы навучаецца каля 540 выхаванцаў. Многія менавіта падчас заняткаў у гуртку «Юны чыгуначнік» задумваюцца і аб выбары будучай прафесіі. Паводле слоў Максіма Маркава, за апошнія пяць гадоў 40—45 % выхаванцаў паступалі па чыгуначным кірунку.



Сам ён таксама ў мінулым выхаванец Дзіцячай чыгункі. Максім Аляксандравіч прызнаецца, што менавіта наведванне гэтага гуртка аказала лёсавызначальны ўплыў на яго будучыню. Спадабалася, зацягнула. Так, яго першым працоўным месцам стаў Мінскі вагонны ўчастак. Пазней малады чалавек быў пераведзены на пасаду інструктара Дзіцячай чыгункі, а з 2022 года стаў яе начальнікам.

Таму Максім Аляксандравіч не па чутках ведае аб тым, што дае выхаванцам гэты гурток.

— Першае, што яны атрымліваюць тут, гэта, вядома, каласальны вопыт і веды, з якімі значна лягчэй будзе асвоіць праграму ў чыгуначнай навучальнай установе. Другое — гэта дысцыпліна. У 13-14 гадоў нашы навучэнцы ўжо кіруюць лакаматывам і нясуць адказнасць за пасажыраў. І тут без дысцыпліны нікуды. Да таго ж, пасля атрымання форменнага адзення яны ўжо не звычайныя школьнікі, а самыя сапраўдныя прадстаўнікі Беларускай чыгункі, што таксама вялікая адказнасць, — дзеліцца Максім Маркаў.

Звычайны дзень на летняй практыцы ў юных чыгуначнікаў дзеліцца на чатыры змены. Першы рэйс з пасажырамі адпраўляецца ў 11.00. Але яны ўжо ў 10.00 прыходзяць на планёрку, дзе іх прызначаюць на пасады, а пасля да 10.40 усе павінны паспець заступіць на свае працоўныя месцы.

Мы якраз трапілі на адну з такіх нарад, якую вёў **першы намеснік начальніка змены Арцём ГРЫНЯВІЦКІ.** Малады чалавек сам з дынастыі чыгуначнікаў, таму любоў да гэтай прафесіі ў яго ў крыві. У гэтым годзе Арцём паступае ў каледж. Ён хоча стаць слесарам па рамонце рухомага саставу.

— У мяне тата працуе машыністам электрацягніка. Таму мяне з дзяцінства прыцягвалі цягнікі, іх магутнасць і прыгажосць. На Дзіцячую чыгунку вырашыў прыйсці пяць гадоў таму і з самага пачатку цвёрда вырашыў, што стану чыгуначнікам, — дзеліцца малады чалавек.

Станцыя «Заслонава», на якой і размяшчаецца Дзіцячая чыгунка, з'яўляецца і пачатковай і канчатковай адначасова. На паўдарозе цеплавоз робіць 5-хвілінны прыпынак на станцыі «Сасновы бор» і зноў вяртаецца на «Заслонава» за новымі пасажырамі. Агульны маршрут падарожжа складае ўсяго 4,5 кіламетра.

У той дзень у першай змене каля пульта кіравання быў і юны машыніст Уладзіслаў Булынько. У свае 15 гадоў малады чалавек вельмі ўпэўнена вядзе лакаматыў па рэйках. За плячыма ў яго ўжо два гады вопыту работы машыністам. Ён прызнаецца, што спачатку было ўсё ж крыху страшна, але Улад хутка ўнік у курс справы і зразумеў, што гэта вельмі займальна і цікава. У планах маладога чалавека — паступленне ў БелДУТ і атрыманне ганаровай прафесіі чыгуначніка.

Побач з ім у кабіне быў і памочнік машыніста Аляксандр Алёхін. Гэтаму маладому чалавеку ўсяго 12 гадоў, цяпер ён на другім годзе навучання. Яшчэ год, і ён гэтак жа, як і таварыш, атрымае правы кіраваць лакаматывам. А пакуль улюбёныя прафесіі Аляксандра — праваднік і памочнік машыніста.

Цікава і тое, што, апрач асноўнай праграмы, для выхаванцаў арганізоўваюцца самыя разнастайныя актыўнасці, сярод якіх шахматныя і шашачныя турніры, спаборніцтвы па футболе. Таксама юныя чыгуначнікі ўвесь час удзельнічаюць у гарадскіх і рэспубліканскіх святах. Так, на 9 Мая яны радуюць мінчан і гасцей сталіцы акцыяй «Эшалон Перамогі», падчас якой выхаванцы Дзіцячай чыгункі ў савецкай форме працуюць праваднікамі. У Дзень Незалежнасці тут запускаюць «Славянскі экспрэс», а на зімовыя святы можна трапіць у «Навагодні экспрэс».

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## Марыя БУЧЭНЬ:

# «Брэнд я назвала прозвішчам бацькі...»



Блогер з аўдыторыяй больш чым сорак пяць тысяч чалавек у Instagram, стваральніца ўпрыгожванняў, натхняльніца сотняў дзяўчат і проста сапраўдная прыгажуня — усё гэта пра нашу сённяшнюю гераіню Марыю Бучэнь. Дзяўчына заўсёды жыла ў творчым асяродку, што і паўплывала на яе прафесійны выбар. А вось пра тое, які быў шлях да мары, што дае натхненне і сілы для росту і развіцця, гераіня распавяла нам пры сустрэчы.

***— Марыя, кім вы марылі стаць у дзяцінстве?***

— Самым яркім, што ўспамінаю, было жаданне стаць мадэллю на шоу Victoria's Secret. Я засынала і мроіла, як аднойчы стану такой жа прыгожай і змагу насіць крылы. *(Смяецца.)* Але гэта была не адзіная карцінка ў маёй галаве. Мне заўсёды хацелася, каб мяне слухала і бачыла вялікая колькасць людзей. Я адчувала, што магу выклікаць у іх прыемныя эмоцыі і, знаходзячыся ў цэнтры ўвагі, прынесці ім шмат карысці. У класе сёмым-восьмым думала аб тым, каб стаць дызайнерам, а ў старэйшых класах з прапановы бацькоў захацелася стаць перакладчыкам. Паступіла на бюджэт у Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Але, нягледзячы на тое што ў мяне ўжо ёсць адукацыя, я ўвесь час развіваюся.

***— Дарэчы, пра адукацыю. Я ведаю, што вы наведвалі курсы для тэлевядучых...***

— На тэлевядучую я пайшла навучацца на чацвёртым курсе ўніверсітэта, бо заўсёды адчувала сарамлівасць перад камерай і была ўпэўненая, што на фота і відэа выглядаю недарэчна. Я падумала, што гэтае навучанне дапаможа мне не саромецца сваіх голасу, знешнасці і атрымаць навыкі прыцягнення людзей да сябе. У цэлым навучанне было цікавым, але не ўсе метады мяне задавальнялі, я чакала атрымаць больш ведаў і інструментаў для працы. Пасля выпуску спрабавала трапіць на тэлебачанне, але неяк не склалася. Магчыма, і да лепшага, бо я не люблю ранні пад'ём.

***— І вы вырашылі стаць блогерам?***

— Пасля ўніверсітэта я трапіла па размеркаванні на самую лепшую кафедру РІВШа — кафедру маладзёжнай палітыкі. Мне вельмі падабаўся калектыў, асабліва загадчыца кафедры Алена Стэфанаўна. Яна паверыла ў мяне і ўзяла пад сваё крыло. Я выкладала фанетыку англійскай мовы (гучанне), гутарковую англійскую, вяла групы павышэння кваліфікацыі. Групы ў мяне складаліся з выкладчыкаў ВНУ і мяняліся кожныя тры-чатыры месяцы. Мне было цяжка кожны раз адаптавацца і заваёўваць павагу ў прафесіяналаў. Заняткі заўсёды былі крэатыўныя, абавязкова з адпрацоўкай вуснага маўлення. Аднойчы паляцела на канферэнцыю ў Брусель, выступала ў якасці адзінага прадстаўніка ад Беларусі. Было вар'яцкі займальна, і ў той момант я зразумела, што абавязкова буду шмат падарожнічаць. Калі ў 2019 годзе кафедра перайшла працаваць у анлайн, мне стала цяжка, бо даводзілася ўвесь час сядзець на адным месцы каля камп'ютара, весці пары без асабістага кантакту з людзьмі было ўжо не так цікава. Праз паўтара года я выгарала ад такой працы і папрасіла мяне звольніць.

***— Дык вось што стала стартам блогінгу...***

— Старонку ў Instagram я стварыла яшчэ на адной з пар на першым курсе. Назіраючы, як мая аднагрупніца залівае туды свае фатаграфіі і атрымлівае «сэрцайкі», я таксама ўстанавіла дадатак, каб заліваць фоткі. Спачатку мой Instagram быў проста звычайнай старонкай пра жыццё, потым я залівала фатаграфіі з прымерачных у крамах і падарожжаў. А вось перыяд, калі трапіла працаваць блогерам у Slivki.by, быў не з лёгкіх. Я прыйшла ў праект, увогуле не разумеючы, што трэба рабіць. Каля года вучылася і была «ценем» усёй каманды. Калі ты самы неспрактыкаваны, табе альбо дапамагаюць, альбо цябе «штурхаюць». Са мной здарылася пяцьдзясят на пяцьдзясят. Праз год упартай працы ў мяне з'явілася свая разыначка, я рабіла менш памылак, зразумела, як прыцягваць людзей да прагляду ролікаў са мной. Кожны раз, калі прапрацоўвала свае памылкі, станавілася больш вопытнай, і мне давалі самых цяжкіх партнёраў у працу.

***— Што спатрэбілася, каб дасягнуць вяршыняў у гэтай справе?***

— Прыйшлося вывучаць шмат сфер: мэблю, б'юці, моду, я нават чытала і глядзела ўрокі рэжысёраў, каб быць лепшай у працы. Праз два з паловай года мне прапанавалі стаць кіраўніком аддзела блогераў. Супраціўлялася дастаткова доўга, але ў выніку пагадзілася. Рашэнне было правільным, бо быць кіраўніком гатовы і здольны не кожны, чалавеку павінны быць уласцівыя пэўныя якасці, якія дазволяць развязваць непрадузята, не забыцца ў любой сітуацыі выконваць этыку і быць заўсёды «за» сваю каманду, навучыць працаваць разам, асабіста з кожным прапрацоўваць яго эфектыўнасць. На пасадзе была паўтара года, гэта быў перыяд загартоўкі характару.

***— Цяпер вы вядомая не толькі як блогер, але і як стваральніца свайго брэнда ўпрыгажэнняў...***

— Увосень запусціла першую калекцыю ўпрыгажэнняў. Брэнд назвала прозвішчам бацькі — BUCHEN, каб яно жыло доўга-доўга. Ідэя ўзнікла тады, калі я ламала галаву, з чаго ж пачаць. Калі апісаць упрыгажэнні адным словам, то няхай гэта будзе слова «талісман». Я з вялікай любоўю стаўлюся да жанчын і іх прыгажосці, але якой бы ні была прыгожай жанчына, прысутнічае няўпэўненасць у сабе, якая не дае вырасці, праяўляцца ўсёй яе энергіі, сіле, патэнцыялу. Таму я хачу, каб кожнае ўпрыгажэнне, зробленае мной, станавілася талісманам упэўненасці для жанчын, каб аздабленні нагадвалі кожнай пра здольнасць распаліць святло ў сэрцах людзей.

***— З якімі цяжкасцямі прыйшлося сутыкнуцца ў гэтай справе?***

— У першую чаргу — са страхам няўдачы. Пасля з'явілася новая праблема — якасныя матэрыялы, іх наяўнасць і кошт. У Беларусі цяжка купіць шмат якасных пацерак ці камянёў за раз. Крам з такім таварам мала, а попыт вялікі, таму вельмі цяжка паспець ухапіць па нармальным кошце добры тавар... З-за гэтага сабекошт вырабу часта непрадказальны, цяпер спрабую вырашыць гэту праблему і шукаю надзейнага пастаўшчыка. Стараюся выкарыстоўваць натуральныя матэрыялы, камяні, якаснае шкло... У будучыні адкрыю краму, дзе будуць не толькі ўпрыгажэнні, але і адзенне з сэнсам.

***— Дарэчы, пра адзенне. Вы ж яшчэ займаецеся і касцюмізацыяй...***

— Так, захапілася ёй пасля заканчэння ўніверсітэта. Я не зарабляла тады шмат грошай, каб купіць сабе сапраўды цікавыя рэчы, таму брала рэчы ў добрым стане, якія аддала мне стрыечная сястра, і перараблялa іх. Наогул гэта вельмі займальна і дапамагае расслабіцца. Плюс другаснае спажыванне, і ў выніку атрымліваеш рэч, якой няма больш ні ў кога.

***— А чым вы любіце займацца ў вольны час?***

— У мяне яго амаль няма. Звычайна вельмі занятая і працую. А калі такія рэдкія гадзіны здараюцца, то гуляю ці займаюся творчасцю і рэалізацыяй новай ідэі.

**Ангеліна НОВІКАВА.**

*Карысна ведаць*

# Бывайце, стрэс і пракрастынацыя

Комплекс для павышэння працаздольнасці і самазаспакаення стварылі вучоныя навукова-метадычнай установы БДУ «Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека». Мы пратэсціравалі ўнікальную распрацоўку, і вось што з гэтага выйшла.

У сучасным свеце існуе мноства прычын для стрэсу. У наша жыццё яны ўрываюцца з зайздросным пастаянствам. Так, паводле апытання, праведзенага сёлета Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі, каля трэці расіян сутыкаюцца са стрэсам рэдка ці часам (34 % і 37 %). А 18 % рэспандэнтаў знаходзяцца ў гэтым стане часта ці ўвесь час. У нашай краіне сітуацыя не лепшая: па статыстыцы аналітычнага цэнтра «Бітрыкс24», у 2021 годзе стрэс адчувалі 92 % супрацоўнікаў кампаній Беларусі. А паводле леташняга апытання партала Praca.by, у якім прынялі ўдзел 1350 чалавек, 45,3 % яго ўдзельнікаў увесь час адчуваюць стрэс на рабоце, і больш за 36 % ніяк з ім не змагаюцца.

Але як гэта трэба рабіць? І ці варта? Аказваецца, невялікае хваляванне не прыносіць шкоды арганізму, нават, наадварот, неабходнае для павышэння актыўнасці мозгу і ўвагі. Чаго не скажаш пра моцны і доўгі стрэс, які цягне за сабой складаныя наступствы для здароўя. Сярод іх, напрыклад, захворванні сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм. У барацьбе са стрэсам медыкі раяць умерана займацца спортам і правільна харчавацца. Сон таксама спрыяе хуткаму аднаўленню арганізма і большай устойлівасці да стрэсавых сітуацый. Падобнае можна сказаць і аб занятках любімай справай, зносінах з роднымі і блізкімі. Поўныя рэкамендацыі апублікаваны на сайце Міністэрства аховы здароўя Беларусі.

Спосаб барацьбы са стрэсам на рабоце прапанавалі і вучоныя навукова-метадычнай установы БДУ «Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека». Распрацаваны імі комплекс павінен навучыць чалавека кіраваць рэакцыяй свайго арганізма. Трэнінг створаны на аснове дыхальных практыкаванняў, закліканых дапамагчы дасягнуць аптымальнага псіхічнага і фізічнага стану. Важную ролю іграе і прынцып біялагічнай зваротнай сувязі. Гэта методыка тэрапіі, з дапамогай якой пацыенты вучацца кантраляваць некаторыя ўнутраныя рэакцыі, такія як дыханне і частата сардэчных скарачэнняў. Такі комплекс можна ўкараняць у розныя прадпрыемствы, каб пры неабходнасці прайсці трэнінг мог любы супрацоўнік арганізацыі. Дарэчы, падыдзе ён і для прафілактыкі і лячэння псіхалагічных захворванняў, напрыклад СДУГ і АКР.

А што ўяўляе сабой комплекс для самазаспакаення? На першы погляд, нічога незвычайнага: камп'ютар, некалькі датчыкаў і акуляры віртуальнай рэальнасці. Адзін з распрацоўшчыкаў навінкі, **малодшы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскага цэнтра праблем чалавека БДУ Антон ДЗЕМ'ЯНОВІЧ**, тлумачыць: навукоўцы стварылі ўласныя праграмнае забеспячэнне і прылады. Менавіта да яе і падключаюцца акуляры і розныя датчыкі: дыхання, пульсу, тэмпературы, а таксама датчык электрычнай актыўнасці скуры. Апарат, падобны на невялікую скрыначку, займаецца апрацоўкай інфармацыі з датчыкаў.

Пакуль прыладу ўключаюць і наладжваюць, даведваюся пра сёе-тое. Аказваецца, не варта чакаць стабільнага выніку пасля першага сеанса:

— Першы трэнінг азнаямленчы. На наступных сеансах чалавек паступова трэніруецца кіраваць сваімі фізіялагічнымі працэсамі. Усяго патрэбна 10-12 наведванняў пад кантролем спецыяліста. Пры апошнім прапаноўваецца прадэманстраваць адпрацаваныя навыкі ўжо без прынцыпу зваротнай сувязі, — распавядае Антон Дзем'яновіч, надзеючы мне на галаву VR-акуляры.

Перад вачыма з'яўіўся экран, а на ім — заданне, якое неабходна выканаць. Спачатку трэба было глыбока ўдыхнуць і выдыхнуць. Дарэчы, у стрэсавых сітуацыях нам уласціва дыхаць грудзьмі. А вось дыханне жыватом, гэта значыць дыяфрагмай, дапамагае людзям кантраляваць свой фізічны стан і тым самым зменшаць узровень стрэсу, што садзейнічае павышэнню працаздольнасці.

Павольна змяняюцца адна за адной фатаграфіі прыроды: хваёвыя лясы, звілістыя рэчкі, а потым — райскія астравы ў бязмежным акіяне. А на фоне — ціхая спакойная мелодыя. Наогул выкарыстанне тэхналогіі віртуальнай рэальнасці — галоўная перавага распрацаванага вучонымі БДУ комплексу. Калі чалавек сыходзіць у створаную спецыяльна для яго прастору, рэзка памяншаецца колькасць фактараў, якія адцягваюць яго ўвагу. А эфектыўнасць трэнінгу павялічваецца ў разы.

Удых, а потым зноў выдых. Паступова ў галаве, дзе зусім нядаўна, нібы пчолы ў вуллі, раіліся думкі, становіцца пуста. З'яўляецца прыемнае, мяккае пачуццё расслаблення. Дасягнуць яго аказалася зусім не складана. Няма і асаблівых абмежаванняў па здароўі. Праўда, людзям з праблемамі з сэрцам ці дыхальнай сістэмай лепш карыстацца комплексам асцярожна.

Раптам надпіс «Расслабцеся і ні пра што не думайце» знікае з экрана. Вось так, зусім непрыкметна прайшлі 12 хвілін сеанса.

Распрацоўшчыкі запэўніваюць: у планах — зрабіць комплекс даступным шырокаму колу людзей. Спадзяемся, што гэта будзе магчыма ўжо ў хуткім часе.

**Аміна НАЗАРАВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.892.
Нумар падпісаны ў 19.30 07.08.2024 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00085** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь), 220007, г. Минск, ул. Московская, д. 14, тел. 8 (017) 309 16 16 (вн. 6611).

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 23.08.2024 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 250/С-28958 общей площадью 459,1 кв. м, наименование – здание ИВЦ и отдела сбыта, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: холодная пристройка, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101/16.

Кап. строение с инв. № 250/С-343606 наименование – ограждение территории, назначение – сооружение неустановленного назначения, длина ограждения – 30,49 м, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Ленинградская, ограждение территории в районе здания № 101/16.

Вышеуказанные кап. строения расположены на зем. участке с кадастровым № 223850100003002559 площадью 0,1397 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101/16 (право аренды, доля 1/1), целевое назначение зем. участка – для строительства и обслуживания здания административно-хозяйственного.

**Нач. цена: 13823,00 бел. руб.** с учетом НДС. **Задаток: 1382,30 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 22.08.2024.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторных электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов не позднее 15 рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в соответствии с договором купли-продажи. В случае наличия ходатайства от победителя эл. торгов (претендента на покупку) Продавцом может быть рассмотрен вопрос о предоставлении рассрочки оплаты на срок до 24 месяцев. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество – складские, производственные здания и помещения. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Климович Анна Витальевна, +375 (29) 500 56 55.

---

В **суд Советского района г. Гомеля** поступило заявление Фатневой Ирины Владимировны об объявлении умершим гражданина КАСПЕРОВИЧА Вячеслава Александровича. 01.07.1970 года рождения, последнее место жительства: Брестская обл., г. Берёза, ул. Советская, д. 37, кв. 2.

Всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Касперовиче Вячеславе Александровиче, просьба сообщить их суду Советского района г. Гомеля в течение двух месяцев с момента публикации в газете по адресу: г. Гомель, пр. Речицкий, 45 или по телефонам: 8 0232 29-44-93. 8 0232 29-44-73.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вилейский комбикормовый завод» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

<u>**лот № 1:**</u> **свиноводческий комплекс «Брусы»** (составные части и принадлежности: сети водоснабжения, сети канализации, сети электроснабжения, покрытие (3 шт.), ограждения (3 шт.), дезбарьер (2 шт.), столовая, весовая по отгрузке свиней, мастерские – столярный цех, здание мазутонасосного хозяйства, хрячник, племферма, КНС № 4, цех убоя свиней, центральная весовая, корпус № 10, корпус № 9, КНС № 3, корпус № 8, корпус № 7, корпус № 6, КНС № 1, корпус № 5, корпус № 4, корпус № 3, КНС № 2, корпус № 2, корпус № 1, склад № 1, склад № 2, склад № 3, склад № 4, склад комбикормов, АЗС, административное здание, склад и оборудование (шахта вытяжная вентиляции D650 мм (инв. № 62), система кормления свиней (2 бункера для хранения и подачи кормов) (инв. № 167), система кормления свиней (2 бункера) (инв. № 86), станок для свиноматки (инв. № 290), кормушка для свиноматки (инв. № 76), станок для свиноматки (инв. № 72), станок для свиноматки (инв. № 78), система автоматического кормления свиней (инв. № 70), кормушка для свиней (инв. № 296), кормушка для свиней (инв. № 74), система кормораздачи, кормления и водопоения (инв. № 9), система навозоудаления (инв. № 26), система навозоудаления (инв. № 67), мотор-редуктор приводной станции (инв. № 1245), мотор-редуктор приводной станции CM 075 FS 40 90 B5 M1 1.50 kw (инв. № 1421), кормушка для поросят (инв. № 68), кормовой аппарат ящичного типа для откорма (инв. № 720), кормовой аппарат ящичного типа для откорма (инв. № 721), кормовой аппарат ящичного типа для откорма (инв. № 722), кормопровод для раздачи кормов (инв. № 286), система кормораздачи и кормления (инв. № 288), кормушка для свиней (инв. № 175), система кормораздачи и кормления свиней (инв. № 291), кормовой аппарат для свиней (инв. № 87), решетка напольная (инв. № 66), ограждение из ПВХ для свиней (инв. № 169), опора решетки для свиней (инв. № 287), сдвоенный кормовой аппарат (инв. № 292), сдвоенный кормовой аппарат (инв. № 73), вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д-1 (инв. № 685328), вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д-3 (инв. № 685330), вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д-2 (инв. № 685329), вентиляторы ВСБ-4.0 с электродвигателем (инв. № 133), вентиляторы ВСБ-4.0 с электродвигателем (инв. № 134), вентиляторы ВСБ-4.0 с электродвигателем (инв. № 135), система вентиляции: 4 вентилятора ВО 5,6-А370/6Д (инв. № 1742), система вентиляции: вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д (инв. № 1570), бункер из стекловолокна для хранения и подачи комбикорма (инв. № 89), бункер из стекловолокна для хранения и подачи комбикорма (инв. № 284), теплогенератор (инв. № 246), теплогенератор (инв. № 247), кран-балка (инв. № 507), электроталь (инв. № 122), котел паровой КВ-300 (инв. № 36), котел паровой КВ-300 (инв. № 204), стрелка переводная 1П-2 (инв. № 965), теплогенератор (инв. № 244), холодильная камера низкотемпературная (инв. № 492), холодильный агрегат на базе герметичного компрессора (инв. № 491), насос жидкостный НЖН-200А (инв. № 203), насос жидкостный НЖН-200 с двигателем 22\1000 (инв. № 206), насос центробежный ННФ 00.010 СБ (инв. № 208), насос центробежный ННФ 00.10 СБ (инв. № 209), насос центробежный ННФ 00.010 СБ (инв. № 207), насос жидкостный НЖН с электродвигателем (инв. № 253), котел водонагревательный КСВ-0,09 (инв. № 1200), насос центробежный ННФ 00.10 СБ (инв. № 210), чан шпарильный со скребмашиной ПМ-ФЧШ-С2ПЩ (инв. № 301), система дезинфекции автотранспорта на КПП (инв. № 258), теплогенератор-2000 (инв. № 69), таль электрическая РА-500 (инв. № 501), шнек для кормораздачи (инв. № 701), шнек для кормораздачи (инв. № 703), бункер из стеклопластика (3,6 т) (инв. № 700), бункер из стеклопластика (3,6 т) (инв. № 702), весы электронные монорельсовые на 500 кг (инв. № 8965), система теплых полов (инв. № 82), секция нагревательная кабельная 20 ТЛОЭ2 на 2 станка (инв. № 293), секция нагревательная кабельная 15 ТЛОЭ2 на 1 станок (инв. № 294), комплект весового оборудования (весовая), бочка ХТС-100, 1986 г.в. (инв. № 147), прицеп ПЖ-271 (инв. № 280), **расположенный на земельном участке площадью 27,9131 га с кадастровым номером 624084000001000005** (право постоянного пользования, ограничение в использовании – охранная зона линий электропередачи, пл. 2,2100 га) **по адресу: Минская область, Мядельский район, Сватковский с/с, 8, вблизи д. Брусы.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 218 335,20 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **321 833,00 бел. руб.**

<u>**Лот № 2:**</u> **автомобиль грузовой специальный самосвал САЗ-3507, 1986 г. в., регистрационный знак АА 4924-5, рама без номера, цвет голубой, инв. № 103.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **4 680,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **468,00 бел. руб.**

<u>**Лот № 3**</u>**: машина для внесения жидких органических удобрений МЖТ-10, 2013 г. в., регистрационный знак ОН-5 0332, шасси без номера, инв. № 502.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **18 000,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **1 800,00 бел. руб.**

<u>**Лот № 4:**</u> **тележка-трап ТТ-1С, год выпуска не установлен, инв. № 90.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **3 360,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **336,00 бел. руб.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55 BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 30 (тридцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2-4 – 10 (десяти) процентов, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ.</u> Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **09.09.2024 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.09.2024** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136 31 11. Тел. для осмотра 8 (044) 733-04-55.**

УНП 600010651

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Ленина, 46. УНП 100868495 |
| **Предмет аукциона** (одним лотом) **Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16** | |
| <u>**Производственная база**</u> в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **литейный цех** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат.помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженер. корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). В состав лота входит иное имущество в количестве 36 единиц (подробный перечень на сайте организатора аукциона www.cpo.by) | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га) | |
| <u>**Обременения по лоту**</u>**:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона. На территории лота расположено защит. сооружение ГО, которое не входит в состав лота. Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварит. договор аренды на часть кап. строения, инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2 рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварит. договором о заключении договора аренды части кап. строения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона. Все вопросы, связанные с планами развития территории, на которой расположены объекты недвижимости, входящие в состав лота, а также перспективами их сноса и реконструкции, участник аукциона уточняет самостоятельно до начала аукциона в уполномоченных государ. организациях, ответственных за составление проектов детальной планировки данных территорий в соответствии с генпланом развития г. Минска | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 36 922 723,27 бел. руб.** Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30 (тридцать) рабочих дней** после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единствен. участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,12 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.07.2024 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона: 20.08.2024 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1607, ЗАО «Центр промышленной оценки». Дата и время окончания приема документов: 19.08.2024** до 17.00 по тому же адресу | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29 154-34-35. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by** | |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 212 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский картонажно-полиграфический комбинат «Покровский», Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Покровская, 5, тел.: +375 (212) 665361, +375 (29) 5121943.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49794 площадью 803,9 кв.м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, наименование – ангар-склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота. Кап. строение с инв. № 200/С-49795 площадью 49,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А/2, наименование – сторожевая, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: два навеса, шесть складов, проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000002000187 (право постоянного пользования) площадью 0,3992 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, целевое назначение – земельный участок для обслуживания ангар-склада и сторожевой. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности. Сооружения благоустройства кап. строений с инв. № 200/С-49794, № 200/С-49795 являются общими сооружениями благоустройства земельного участка с кадастровым номером № 240100000002000187. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена:** 146750,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток** 14675,00 бел. руб.

**Обременение:** договор аренды № 06-12/28 от 01.12.2023 сроком по 02.12.2024.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 26.08.2024 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Срок внесения задатков и приема документов: с 12.08.2024 с 08.30 по 23.08.2024 до 17.30.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK 30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**, **код операции 40901.**

